ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА І МЕНСКАГА КОМІТЭТАЎ ЛЕНІНСКАГА КОМУНІСТЫЧНАГА САЮЗУ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

№ 137 (519) Чацьвер, 8 сьнежня 1927 г. | Выходзе тры разы на тыдню у аўторак, чацьвер і суботу | Год выд. VII. | Рэдактар прымае ад 12 да 2 гадз. дню. Сакратар ад 10—12 і ад 2—3 гадз. Тэл. № 903. | Адрас рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена“: Менск, Комсам. 25.

Няхай жыве ленінская бальшавіцкая партыя!

ДЗЕСЯТКІ ТЫСЯЧ РАБОЧЫХ УСТУПАЮЦЬ У ШЭРАГІ ПАРТЫІ І КОМСАМОЛУ.

78 ТЫСЯЧ НОВЫХ БАЛЬШАВІКОЎ.

Дзесяцігодзьдзе Кастрычніка зьявілася пачаткам новага, другога па ліку, заклiку рабочых у шэрагі комуністычнай партыі.

У адказ на раскольніцкія вылазкі троцкісцкай опозыцыі, у адказ на спробы стварыць другую, троцкісцкую партыю, рабочая кляса адказала проста, ясна і перакаnаўча:

— 78 тысяч рабочых і работніц у апошнія дні ўступілі ў бальшавіцкую партыю. 78 тысяч новых, моцных, фабрыкай выхаваных бальшавікоў—вось лепшы падарунак працоўных Савецкага Саюзу—15-му зьезду УсеКП(б).

Бязупынным струменем таксама ідуць весткі з усіх канцоў Савецкага Саюзу аб масавым уступленьні ў комсамол рабочай моладзі.

Не адстае і рабочая моладзь Беларусі.

Вось што гавораць самыя першыя, прыблізныя лічбы па асобных акругах:

— Па Гомельскай акрузе—68 маладых рабочых падалі заяву аб уступленьні ў партыю і 364 чал.—аб уступленьні ў комсамол.

— Па Меншчыне—130 чалавек падалі заявы ў партыю і 130 чалавек аб уступленьні ў комсамол.

— Па Бабруйшчыне—131 заява аб уступленьні ў комсамол і 315 заяў аб уступленьні ў партыю.

— Па Віцебшчыне—125 заяў—уступленьні ў партыю і 111—у комсамол.

— Па Мазыршчыне—83—у партыю і 70—у комсамол.

— Па Полаччыне—456—у партыю, 44—у комсамол.

Гэтыя першыя, далёка ня поўныя, лічбы гавораць аб тым, што рабочая моладзь, разам з дарослымі рабочымі ў сто разоў колькасна і якасна лепш запоўніць месца выключанай з партыі кучкі раскольнікаў-опозыцыянэраў.

Даклад тав. Сталіна на 15 зьезьдзе комуністычнай партыі разгарнуў усю тую агромністую працу па соцыялістычнай будоўлі, якая няўхільна са дня ў дзень, пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі ажыцьцяўляецца працоўнымі нашай краіны. Але—адзначыў т. Сталін у канцы свайго дакладу— „гэта яшчэ ня значыць, што ў нас ня будзе цяжкасьцяй на нашым шляху. Цяжкасьці будуць. Але мы іх не баімся, бо мы—бальшавікі, загартаваныя ў агні рэволюцыі. Цяжкасьці будуць. Але мы іх пераможам, як перамагалі да гэтага часу, бо мы—бальшавікі, выкаваныя жалезнай партыяй Леніна для таго, каб змагацца з цяжкасьцямі і перамагаць іх, а ня хныкаць і плакаць.

І якраз таму, што мы—бальшавікі, мы пераможам напэўна“. І партыя разам з новым кастрычнікавым папаўненьнем комуністых-рабочых будзе няўхільна ажыцьцяўляць будаўніцтва соцыялізму ў нашай краіне, набліжаючы час перамогі комунізму ва ўсім сьвеце.

На заводзе „Чырвоная Зара“.

Хто падаў заявы.

У партыю.

— «Раз і назаўсёды опозіцыя павінна спыніць сваю супроць-партыйную дзейнасьць. З імі ня трэба няньчыцца»...

Так заявіла **Поля Альпяровіч** член ЛКСМБ з **1923** г. Полю ячэйка рэкомэндавала ў партыю.

Хто яна Поля?

12 год Поля правяла на заводзе.

12 год, з якіх 2 ў цяжкія ў суровыя часы...

12 год праведзеных за доўгім сталом упакоўшчыцы, зрабілі яе моцнай і вытрыманай.

Не адзін чалавек з усяго заводу не знайшоўся, каб даць Полі Альпяровіч адвод у паступленьні ў партыю.

І ён ня знойдзецца. Гэтаму парука—Поліна праца. Яе, як актыўную работніцу, лепшую камсамолку будуць ведаць **як лепшую партыйку.**

Белавус А.

Член комсамолу з **1924** г.

7 год, як Белавус на заводзе. Ён паступіў малапісьменным, забітым батраком. Ён вырас у комсамоле, яго выхаваў комсамол. Ён прайшоў практыку комсамольскай працы.

І ячэйка, ведаючы Белавуса, як лепшага працаўніка, рэкомэндавала разам з шасьцю другімі ў партыю.

Ён працуе ў патачным аддзяленьні. Яго таварышы, старыя рабочыя, любяць. Яны ведаюць Белавуса, як моцнага, свойскага хлапца. І яны шчыра цiснулі рукі яму, калі ячэйка аднагалосна зацьвердзіла яго прыём.

У комсамол.

Левін.

Левіну 20 год. З маленства з 13 год, бацькі паслалі яго на завод. Ён пабываў на многіх, яму цяжка давалася абраная кваліфікацыя.

І цяпер, калі ён цьвёрда стаў на сваю жыцьцёвую дарогу, рашыў падаць заяву ў партыю. Чаму ў партыю?! А таму, піша Левін у заяве, што: «ў цяжкі час перажываемы намі, я рашыў дапамагчы ёй».

Левін—гарачы хлапец. Яму параілі стаць комсамольцам. Вытрэніравацъ сябе на комсамольскай працы. Ён стаў комсамольцам ён будзе гарачым у працы.

Квапінскі А.

Ён год, як на заводзе. Ён мала што яшчэ ведае, але разам з другімі 10 падаў сваю заяву ў камсамольскую ячэйку.

Па віцебскіх ячэйках.

Фабрыка гнутай мэблі.

Агульны сход ячэйкі праходзіў дзелавіта і проста. Сход заслухоўваў заявы паступаючых у партыю. Іх было 10. Ячэйка ўсіх рэкомэндавала.

Ня было ніводнага адводу, ня было ніводнага супроць перададзеных. Іх ведаюць добра дзесяць перададзеных комсамольцаў. Іх ведае фабрыка, як лепшых рабочых.

Фанэрны завод.

На агульным сходзе ячэйкі стаяла толькі адно пытаньне:

— Перадача ў партыю.

Партыйны сход падыйшоў да гэтага сур'ёзна і ўважліва. Кожную кандытатуру доўга абгаварвалі.

І, нарэшце, рашылі зацьвердзіць 14 чалавек. Шмат хто з іх комсамольцы. 14 перададзеных—рабочыя.

Пролетарска-Слабадзкі раён.

Маркаўшчына не адстае ад іншых раёнаў. Сходы ячэек „Дзьвіны“ запягваліся надоўга. Падаўшых заявы падпарадкавалі скрыжаванаму агню пытаньняў...

Па ўсім раёне, уключаючы фанэрны завод і „Дзьвіну“, пакуль што перададзена 73 чалавекі ў партыю.

Заявы яшчэ падаюцца.

Заявы яшчэ ня скончылі падаваць.

(Па тэлефоне ад нашых уласных корэспондэнтаў).

Віцебск, 5 сьнежня. Нельга дакладна падлічыць колькасьць падаючых заявы ў партыю. На 1-га сьнежня падалі заявы—293 ч. На адным толькі Мэтпроме № 3 падалі заявы ... чал. Падаў заяву аб уступленьні ў партыю рабочы кітаец, працуючы на Мэтпроме №5.

Дакладчыкі на 15-ым зьезьдзе УсеКП(б).



СТАЛІН, КАСІОР, КУРСКІ, ОРДЖАНІКІДЗЕ, БУХАРЫН, РЫКАЎ, КРЖЫЖАНОЎСКІ, МОЛАТАЎ.

XV ЗЬЕЗД УсеКП(б)

ПОЛІТЫЧНАЯ СПРАВАЗДАЧА ЦЭНТРАЛЬН. КАМІТЭТУ

ДАКЛАД ТАВ. СТАЛІНА.

КАПІТАЛІЗМ УВАХОДЗІЦЬ У НОВУЮ ФАЗУ БАРАЦЬБЫ ЗА ПЕРАДЗЕЛ СЬВЕТУ

Наша задача—далей адцягнуць няўхільную сутычку між СССР і капіталістычным сьветам.

І. Міжнароднае становішча Савецкага Саюзу

Дыялектыка разьвіцьця капіталізму.

СССР і капіталістычны сьвет.

Наша краіна, таварышы, жыве і разьвіваецца ў абставінах капіталістычнага абкружэньня. Яе знадворнае становішча залежыць ня толькі ад яе ўнутраных сіл, але і ад становішча гэтага капіталістычнага абкружэньня, ад становішча капіталістычных краін, што акружаюць нашу краіну, ад іх сіл і слабасьці, ад сілы і слабасьці прыгнечаных кляс ва ўсім сьвеце, ад сілы і слабасьці рэволюцыйнага руху гэтых кляс.

Я ўжо не кажу аб тым, што наша рэволюцыя ёсьць частка міжнароднага рэволюцыйнага руху прыгнечаных кляс. Вось чаму я думаю, што справаздача ЦК павінна быць пачата з абрысоўкі міжнароднага становішча нашае краіны, з абрысоўкі становішча ў капіталістычных краінах і становішча рэволюцыйнага руху ва ўсіх краінах.

Вытворчасьць і гандаль у капіталістычных краінах.

Першае пытаньне—гэта становішча вытворчасьці і гандлю ў буйнейшых капіталістычных краінах. Асноўны факт ў гэтай галіне, таварышы, зьмяшчаецца ў тым, што вытворчасьць капіталістычных краін за гэтыя 2 гады, за справаздачны пэрыод пераваліла даваенныя нормы, пашла далей даваенных норм. Але затое ёсьць некаторыя капіталістычныя краіны, якія ня ідуць, а скачуць наперад, пакідаючы з-заду даваенны ўзровень, напрыклад, Паўночна-Амэрыканскія Злучаныя Штаты і часткова Японія.

Сусьветны-ж гандаль ідзе ня так шпарка, як вытворчасьці, звычайна ён адстае ад вытворчасьці, але усё-ж ён падышоў да даваеннае нормы. Наогул і цалкам, сусьветны гандаль ужо падышоў да даваеннае нормы, а ў некаторых краінах, напрыклад, у Паўночнай Амэрыцы і Японіі, ужо пераваліў за даваенныя нормы.

Адзначу таксама, што капітал перасягнуў ня толькі па лініі росту продукцыі, таксама як і па лініі гандлю, але і ў галіне палепшаньня тэхнікі вытворчасьці, у галіне тэхнічнага прогрэсу, у галіне рацыяналізацыі вытворчасьці, прычым усё гэта павяло да далейшага ўзмацненьня буйнейшых трэстаў і да арганізацыі новых манапалістычных карцеляў.

Вось факты, таварышы, якія трэба адзначыць і з якіх трэба выходзіць.

Ці стала ўстойлівай стабілізацыя капіталізму?

Ці азначае ўсё гэта, што тым самым стабілізацыя капіталізму стала трывалай, устойлівай? Зразумела, не. Яшчэ на XIV зьезьдзе гаварылася ў дакладзе, што капіталізм можа дасягнуць даваеннае нормы, можа пераваліць праз гэту даваенную норму, можа рацыяналізаваць сваю вытворчасьць, але што гэта яшчэ ня значыць, далёка яшчэ ня значыць, што стабілізацыя капіталізму можа ад гэтага стаць трывалай, што капіталізм можа вярнуць сабе былую даваенную ўстойлівасьць.

Наадварот, з самой стабілізацыі, з таго, што вытворчасьць расьце, з таго, што гандаль расьце, з таго, што тэхнічны прогрэс і вытворчыя магчымасьці ўзрастаюць у той час, як сусьветны рынак, граніцы гэтага рынку і сфэры ўплыву паасобных імпэрыялістычных груп застаюцца больш-менш стабільнымі,—якраз з гэтага вырастае самы глыбокі і самы востры крызіс сусьветнага капіталізму, які цягне за сабою новыя войны і пагражае існаваньню якой-бы там ні было стабілізацыі.

З частковае стабілізацыі вырастае ўзмацненьне крызісу капіталізму, нарастаючы крызіс развальвае стабілізацыю,—такая дыялектыка разьвіцьця капіталізму ў даны гістарычны момант.

Нарастаньне крызісу капіталізму

Найбольш характэрным у гэтым росьце вытворчасьці і гандлю сусьветнага капіталізму зьяўляецца той факт, што разьвіцьцё ідзе няроўнамерна. Разьвіцьцё праходзіць ня так, каб капіталістычныя краіны пасоўваліся наперад адна за другой плаўна і роўнамерна, не перашкаджаючы адна аднэй не адціскаючы адна адну, а наадварот,—шляхам выцясьненьня і ўпадку адных краін, шляхам вылучэньня і ўздыму другіх, у парадку сьмяротнае барацьбы краін за першынства на рынку.

Мірны шлях вырашэньня праблемы рынку застаецца для капіталізму зачыненым. Застаецца адзіны для капіталізма «выхад»—новы падзел колёній і сфэр уплыву, шлях сілы, шлях ваенных сутычак, шлях новых імпэрыялістычных войн. З стабілізацыі нараждаецца нарастаньне крызісу капіталізму.

Барацьба за рынкі і шлях да іх.

У зьвязку з гэтым пытаньне аб перадзеле сьвету і сфэр ўплыву, якое зьяўляецца асноваю замежных рынкаў, ёсьць зараз асноўнае пытаньне у політыцы сусьветнага капіталізму. Сучаснае разьмеркаваньне колёній і сфэр уплыву, устаноўленае ў выніку апошняе імпэрыялістычнае вайны, зьяўляецца ўжо старым. Яно не задавальняе зараз ні Паўночную Амэрыку, для якой мала Паўднёвай Амэрыкі і якая стараецца ўкараніцца ў Азіі (перш за ўсё ў Кітаі), ні Англію, з рук якой зьнікае рад важнейшых рынкаў Усходу, ні Японію якой ўвесь час перашкаджаюць у Кітаі Англія і Амэрыка, ні Італію і Францыю, якія маюць бязьлікую колькасьць прадметаў спрэчак як у прыдунайскіх краінах, так і ў Міжземным моры, ні тым больш. Нямеччыну, якая ўсё яшчэ застаецца без колёній. Адгэтуль «агульнае» імкненьне да новага надзелу рынкаў і крыніц сыравіны.

Сумненьні немагчымы: справа ідзе аб organізацыі новых коаліцый дзяржаў для падрыхтоўкі новых войнаў за замежныя рынкі, за крыніцы сыравіны, за шляхі да іх.

(Працяг на 2-й стар.)

XV ЗЬЕЗД БАЛЬШАВІКОЎ САВЕЦКАГА САЮЗУ.

Савецкая ўлада—самая моцная з усіх існуючых у сьвеце.

Нацыянальны прыбытак СССР за два гады павялічыўся на 41,3 проц., дасягаючы 22.560 мільёнаў рублёў.

Даклад т. Сталіна аб міжнародным і унутраным становішчы Савецкага Саюзу.

(Працяг. Пачатак на першай староны)

Імпэрыялізм рыхтуе новыя бойкі.

Ліга Нацый—шырма для прыкрыцьця новых узброеньняў.

Ці былі спробы „мірнага ўпарадкаваньня» насьпяваючых ваенных конфліктаў за апошні пэрыод? Так, былі. Іх было больш, чым можна было чакаць. Але яны ні да чаго роўна ня прыводзілі. Больш таго, спробы аказаліся толькі прыкрыцьцем падрыхтоўчае работы «дзяржаў» да новых войнаў, прыкрыцьцем якое мае сваёй мэтай ашуканства рабочых і сялян.

Возьмем Лігу Нацый, якая зьяўляецца, па думцы ілжывай буржуазнай прэсы ня менш ілжывай соцыял-дэмакратычнае прэсы, зброяй міру. Да чаго прывяла брахня Лігі Нацый у пытаньні аб міры, аб разброеньні, аб скарачэньні ўзброеньня, апрач новага абвастрэньня насьпяваючых конфліктаў?

Ці-ж можна лічыць выпадковасьцю той факт, што тры гады гаворыць Лігі Нацый аб разброеньні, тры гады падтрымлівае гэтую ілжывую брахню так званы II-гі Інтэрнацыянал, а дзяржавы ўсё ўзбройваюцца і ўзбройваюцца, пашыраючы старыя конфлікты, ствараючы новыя конфлікты і, такім чынам, падрываючы справу міру.

Аб чым гаворыць правал тройственнае конфэрэнцыі па скарачэньні марскіх узброеньняў (Англіі, Амэрыкі і Японіі), як не аб тым, што ціхаакіянская проблема зьяўляецца крыніцаю новых імпэрыялістычных войнаў, што «дзяржавы» ня хочуць ні разбройвацца, ні скарачаць зброі.

3 стабілізацыі вырастае няўхільнасьць новых войн.

Падкупны буржуазны друк усіх краін, ад Японіі да Англіі, ад Францыі да Амэрыкі крычыць ва ўсё горла аб «няшчырасьці» савецкіх прапаноў па разброеньні. Чаму-ж у такім разе не праверыць шчырасьць савецкіх прапаноў і не распачаць зараз-жа практычнае разброеньне, або, па крайняй меры, да сур'ёзнага скарачэньня ўзброеньня. За чым-жа справа стала?

Раней рост узброеньняў апраўдвалі наліччам узброенай з ног да галавы Нямеччыны. Зараз гэтае «апраўданьне» адпадае. Хіба ня ясна, што рост узброеньняў дыктуецца няўхільнасьцю новых імпэрыялістычных войн між «дзяржавамі», што «дух вайны зьяўляецца асноўным зьместам духу Лёкарно».

Я думаю, што цяперашнія «мірныя адносіны» можна было-б упадобіць старой паношанай кашулі, на якой шмат латак, зьвязаных між сабою тоненькаю нітачкаю. Варта толькі пацягнуць больш-мен сур'ёзна за гэту нітачку, абарваць яе ў тым ці іншым месцы, каб разваліласяя ўся кашуля, каб нічога не засталося ад яе.

Варта патрасьці цяперашнія «мірныя адносіны» дзе-небудзь у Албаніі, або Літве, Кітаі, ці Паўночнай Амэрыцы, каб развалі́ўся ўвесь гэты будынак мірных адносін. Так было перад апошняй імпэрыялістычнай вайною, калі забойства ў Сараеве прывяло да вайны. Так стаіць справа і зараз. З стабілізацыі вырастае няўхільнасьць імпэрыялістычных войн.

Прадвесьнікі новага рэвалюцыйнага ўздыму ў Эўропе.

Імпэрыялістычны тыл ненадзейны.

Далей тав Сталін гаворыць аб становішчы сусьветнага рэволюцыйнага руху і прадвесьніках новага рэволюцыйнага ўздыму.

Каб весьці вайну, не даволі росту ўзброеньняў, не даволі організацыі новых коаліцый. Для гэтага неабходна яшчэ ўмацаваньне тылу ў краінах капіталізму. Ні адна капіталістычная краіна ня можа весьці сур'ёзнай вайны, не ўмацаваўшы спачатку свой уласны тыл, не абуздаўшы «сваіх» рабочых і «сваіх» колёній.

Адсюль паступовая фашызацыя палітыкі буржуазных урадаў. Адсюль націск на рабочую клясу—закон аб профсаюзах у Англіі, закан аб «узброеньні нацыі» ў Францыі, ліквідацыя васьмігадзіннага рабочага дня ў радзе краін, паўсюдашні наступ буржуазіі на пролетарыят. Адсюль узмоцнены націск на колёніі і залежныя краіны, павялічэньне колькасьці імпэрыялістычнага войска ў гэтых краінах, лічбовы склад якога дасягае мільёну, прычым больш 700.000 салдат расквартэравана ў брытанскіх «сфэрах уплыву» і «ўладаньнях».

У нетрах пролетарыяту накапілася рэволюцыйная энэргія.

Той факт, што кітайская рэволюцыя не прывяла яшчэ да простай перамогі над імпэрыялізмам, гэты факт ня можа мець рашаючага значэньня ў сэнсе пэрспэктыў рэволюцыі. Вялікія народныя рэволюцыі ніколі наогул не перамагаюць да канца ў першым туры сваіх выступленьняў. Яны растуць і ўзмацняюцца ў парадку прыліваў і адліваў. Так было ўсюды, ў тым ліку і ў Расіі. Так будзе і ў Кітаі.

Што датычыць рэволюцыйнага руху рабочае клясы Эўропы, дык і тут і ў гэтай галіне мы маем выразныя адзнакі палявеньня рабочых нізоў і рэволюцыйнага ажыўленьня. Калі такі факт, як забойства Сако ці Ванцэці, можа паслужыць повадам для дэмонстрацыі рабочае клясы, дык гэта з бясспрэчнасьцю гаворыць аб тым, што ў нетрах рабочае клясы накапілася рэволюцыйная энэргія, якая шукае і будзе шукаць повад, выпадку, часам самага нязначнага, для таго, каб прарвацца на паверхне і абрушыцца на капіталістычны рэжым.

Мы жывём напярэдадні новага рэволюцыйнага ўздыму як у колёніях, так і ў мэтрополіях. З стабілізацыі вырастае новы рэволюцыйны ўздым.

Калі два гады назад можна было казаць аб адлівах рэволюцыйных хваль у Эўропе, дык цяпер мы маем усе падставы сьцьвярджаць, што Эўропа зусім выразна ўступае ў паласу новага рэволюцыйнага ўздыму. Я ўжо не гавару аб колёніяльных краінах, дзе становішча імпэрыялістых становіцца ўсё больш і больш катастрафічным.

СССР—вялічэзны фактар разлажэньня імпэрыялізму

Згінулі надзеі імпэрыялістых на прыручэньне СССР, на яго капіталістычнае перараджэньне, на падзеньне яго аўторытэту сярод рабочых Эўропы і працоўных мас калёній. СССР расьце і разьвіваецца якраз як краіна, дзе будуецца соцыялізм. Яго ўплыў сярод рабочых і сялян усяго сьвету расьце і ўзмацняецца. Самае існаваньне СССР, як краіны, дзе будуецца соцыялізм, зьяўляецца адным з вялічэйшых фактараў разлажэньня сусьветнага імпэрыялізму і падрыву яго ўстойлівасьці як у Эўропе, так і ў колёніях. СССР зусім выразна становіцца сьцягам рабочае клясы Эўропы і прыгнечаных народаў калёній.

Для таго, каб расчысьціць глебу для будучых імпэрыялістычных войн, больш грунтоўна заціснуць «сваю» рабочую клясу і абуздаць «свае» колёніі на прадмет умацаваньня капіталістычнага тылу,—трэба перш за ўсё абуздаць СССР, гэты ачаг і рассаднік рэволюцыі, які, да таго-ж, прадстаўляе адзін з вялічэйшых рынкаў збыту для капіталістычных краін.

Адсюль ажыўленьне інтэрвэнцыяніцкіх тэндэнцый сярод імпэрыялістых, політыка ізоляцыі СССР, політыка абкружэньня СССР, політыка падрыхтоўкі абставін для вайны з СССР.

Барацьба двух тэндэнцый сярод капіталістычных дзяржаў.

Барацьба двух тэндэнцый у адносінах між капіталістычным сьветам і СССР: тэндэнцыі ваеннае агрэсіі (Англія перш за ўсё) і тэндэнцыі працягваньня мірных адносін (рад іншых капіталістычных дзяржаў) зьяўляецца, дзеля гэтага, асноўным фактам у сыстэме нашых замежных адносін у даны момант.

Факты, якія паказваюць тэндэнцыю мірных адносін за справаздачны пэрыод: угавор з Турцыяй аб ненападзе, гарантыйны ўгавор з Нямеччынай; мытная згода з Грэцыяй: згода з Нямеччынаю аб крэдытах: прызнаньне Уругваем; гарантыйны ўгавор з Аўганістанам; гарантыйны ўгавор з Літвою; парафіраваньне гарантыйнага ўгавору з Латвіяй; угавор з Турцыяй; упарадкаваньне конфлікту з Швэйцарыяй; угавор аб нэйтралітэце з Пэрсіяй; палепшаньне адносін з Японіяй; рост экономічнае сувязі з Амэрыкай і Італіяй.

Факты, якія паказваюць тэндэнцыю ваеннай агрэсыі за справаздачны пэрыод: ангельская нота з повадў грашовае дапамогі бастуючым вугляконам; налёт у Пекіне, Цянь-Цьзіне і Шанхаі; налёт на Аркос, разрыў Англіі з СССР; забойства Войкава; тэрорыстычныя акты ангельскіх наймітаў у СССР; абвастрэньне адносін з Францыяй у пытаньні аб адклікаьні Ракоўскага.

Калі 2 гады таму назад можна было і трэба было гаварыць аб пэрыодзе некаторае роўнавагі і «мірнага сужыцьця» між СССР і капіталістычнымі краінамі, дык зараз мы маем усе падставы сьцьвярджаць, што **пэрыод мірнага сужыцьця адыходзіць у мінулае**, уступаючы месца пэрыоду імпэрыялістычных наскокаў і падрыхтоўцы інтэрвэнцыі супроць СССР. Адсюль задача—**падлічыць супярэчнасьці ў лягеры імпэрыялістых, адцягнуць вайну, адкупіўшыся ад капіталістых, і ўжыць усе меры да захаваньня мірных адносін.**



Камнем перашкоды зьяўляецца часам пытаньне аб даўгох і крэдытах.

Факты гавораць, што мы маем некаторыя дасягненьні ў галіне атрыманьня прамысловых крэдытаў. Я маю на ўвазе ў даным разе ня толькі Нямеччыну, але і Амэрыку, і Англію. У чым тут сакрэт? У тым, што наша краіна зьяўляецца вялізарным рынкам для ўвозу абсталяваньня, а капіталістычным краінам патрэбен збыт якраз гэтага роду продуктаў.

Вывады.

У выніку мы маем: **папершае**, рост супярэчнасьцяй унутры капіталістычнага абкружэньня; неабходнасьць для капіталізма новага перадзелу сьвету праз войны; інтэрвэнцыяніцкія тэндэнцыі аднае часткі капіталістычнага сьвету на чале з Англіяй; нежаданьне другое часткі капіталістычнага сьвету ўвязвацца ў справу вайны з СССР, і большая пажаданасьць для іх наладжаньня гаспадарчае сувязі з Саюзам; наяўнасьць барацьбы гэтых двух тэндэнцый дае пэўную магчымасьць для СССР падлічыць гэтыя супярэчнасьці для захаваньня міру.

Па-другое, мы маем: стабілізацыю капіталізма, якая развальваецца; рост калёніяльна-рэволюцыйнага руху; адзнакі новага рэволюцыйнага ўздыму ў Эўропе; рост аўторытэту Комінтэрну і яго сэкцый ва ўсім сьвеце; яўны рост сымпатый рабочае клясы Эўропы да СССР; рост магутнасьці СССР унутры краіны і ўзмацненьне аўторытэту рабочае клясы нашае краіны сярод прыгнечаных клясаў усяго сьвету. Адсюль задачы партыі:

1. Па лініі міжнароднага рэволюцыйнага руху: а) барацьба за разьвіцьцё комуністычных партый ва ўсім сьвеце; б) барацьба за ўмацаваньне рэволюцыйных профсаюзаў і адзінага фронту рабочых супроць наступу капіталу; в) барацьба за ўмацаваньне прыязьні між рабочаю клясаю СССР і рабочаю клясаю капіталістычных краін; г) барацьба за ўзмацненьне змычкі між рабочаю клясаю СССР і вызваленчым рухам калёніяльных краін.

2) Па лініі замежнае політыкі СССР: а) барацьба супроць падрыхтоўкі новых імпэрыялістычных войн; б) барацьба з інтэрвэнцыяніцкімі тэндэнцыямі Англіі і ўмацненьне абароназдольнасьці СССР; в) політыка міру і захаваньне мірных адносін з капіталістычнымі краінамі: г) пашырэньне нашага таваразвароту з пазамежжам на аснове ўмацаваньня замежнага гандлю; д) зближэньне з гэтак званымі «слабымі» і «няпоўнапраўнымі» дзяржавамі, якія церпяць прыгнёт і эксплёатацыю пануючых імпэрыялістычных дзяржаў.

II. Унутраное становішча Савецкага Саюзу.

Рэкордны рост нацыянальнага прыбытку.

Пераходзячы да посьпехаў соцыялістычнага будаўніцтва і ўнутранога становішча СССР, тав. Сталін сказаў:

У 1924-25 годзе валавая прадукцыя сельскае гаспадаркі складала, паводле новых разьлікаў Дзяржпляну, 87,3 проц. даваеннае, а продукцыя ўсяе прамысловасьці—63,7 проц. даваеннае. У 1926-27 годзе продукцыя сельскае гаспадаркі складае ўжо 100,3 проц., а продукцыя прамысловасьці—100,2 проц.

Паводле кантрольных лічбаў Дзяржпляну на 1927-28 г., продугледжваецца далейшае павялічэньне продукцыі сельскае гаспадаркі да 111,8 проц. даваеннае, а прамысловасьці—да 114,4 проц.

Калі ўзяць разьмеры гандлёва-пасрэдніцкага звароту 1924-25 году за 100 (14.613 мільён. чырвонных руб.), дык у 1926-27 г. мы маем павялічэньне на 97 проц. (28.775 мільён руб.), а 1927-28 годзе прадугледжваецца далейшы рост да 116 проц. (33.440 мільён. руб.).

Калі ўзяць сводныя балянсы ўсіх нашых крэдытных установ на 1 кастрычніка 1925 г. за 100 (5.343 мільёны чырв. руб.), дык на 1 ліпеня 1927 г. мы маем рост на 53 пр. (8.175 міл. руб.). Няма падстаў сумнявацца ў тым, што 1927-28 год дасьць далейшы рост нашае рацыяналізаванае крэдытнае сыстэмы.

За 1924-25 г. мы мелі грузазвароту па ўсёй нашай чыгуначнай сетцы 63,1 проц. даваеннага, а ў 1926-27 г. мы маем 99,1 проц., а ў 1927-28 г. будзем мець 111,6 проц.

Чыгуначная сетка за гэтыя два гады павялічылася з 74,4 тысячы кілёмэтраў да 76,2 тысяч кілёмэтраў, што складае павялічэньне проці даваеннага ўзроўню на 30,3 проц., а проці 1917 г.—на 8,9 проц.

Сводны бюджэт (адзіны дзяржаўны бюджэт плюс мясцовыя бюджэты) складаў у нас на 1925-26 г. 72,4 проц. даваеннага (5.024 міл. руб.), а на 1927-28 годзе ён павінен скласьці 110-112 проц. ад даваеннага (больш 7 мільярдаў руб.). Прырост за два гады—41,5 проц.

Агульны зварот замежнага гандлю ў 1924-25 г. складаў 1282 мільёны р., г. зн. каля 27 проц. даваеннага. У 1926-27 г. мы мелі зварот у 1.483 мільёны руб., г. зн. 35,6 проц. даваеннага, а ў 27-28 г. прадугледжваецца мець 1.626 мільёнаў руб., г. зн. 37,9 проц. даваеннага. Прычыны прыпыненьня тэмпу разьвіцьця замежнага гандлю папершае ў тым, што буржуазныя дзяржавы нярэдка ставяць перашкоды нашаму замежнаму гандлю, якія часамі пераходзяць у скрытую блякаду; потым, тым, што мы ня можам гандляваць па буржуазнай формуле: «самі не зьядзім а вывозіць будзем». Плюсам тут зьяўляецца актыўнае сальдо па Камісарыяту Замежнага Гандлю за 1926-27 годзе у суме 57 мільёнаў руб. Гэта першы год пасьля 1923-24 г., калі баланс замежнага гандлю зводзіцца з плюсам.

У выніку, мы маем наступны малюнак агульнага росту ўсяго нацыянальнага прыбытку за гэтыя два гады, калі лічыць, што ў 1924-25 г. нацыянальны прыбытак СССР складаў 15.589 міліёнаў чырвонных рублёў, дык у 1925-26 г. мы мэлі 20.252 міліёны руб., г. зн. прырост за год на 29,9 проц., а ў 1926-27 г.—22.560 міліёнаў руб. г. зн. прырост за год на 11,4 проц. Паводле кантрольных лічбаў Дзяржпляну ў 1927-28 г. мы будзем мець 24.208 міліёнаў руб., г. зн. прырост на 7,3 проц. Калі прыняць пад увагу, што сярэдні штогодны прырост нацыянальнага прыбытку Злучаных Штатаў не перавышае 3-4 проц. (толькі адзін раз у 80 гадох мінулага веку Злучаныя Штаты мелі каля 7 проц. прыросту нацыянальнага прыбытку), а штогодны прырост нацыянальнага прыбытку іншых краін, напрыклад, Англіі і Нямеччыны не перавышае 1-3 пр., дык трэба прызнаць, што тэмп росту нацыянальнага прыбытку СССР за апошнія гады зьяўляецца рэкордным у параўнаньні з буйнымі капіталістычнымі краямі Эўропы і Амэрыкі.

Вывад: народная гаспадарка нашае краіны расьце шпаркім тэмпам.

Задача партыі: пасоўваць далей разьвіцьцё народнае гаспадаркі нашае краіны па ўсіх галінах вытворчасьці.

Рост соцыялістычных элемэнтаў гаспадаркі.

Рост народнае гаспадаркі,—кажа далей тав. Сталін,—ідзе ў нас не ў сьляпую, не ў парадку простага колькаснага росту продукцыі, а ў строга вызначаным напрамку. Рашаючымі фактарамі ў справе разьвіцьця народнае гаспадаркі за апошнія два гады зьяўляюцца дзьве акалічнасьці. Па-першае, разьвіцьцё нашае народнае гаспадаркі ідзе пад знакам індустрыялізацыі краіны, пад знакам росту ролі прамысловасьці ў адносінах сельскае гаспадаркі.

Па-другое, разьвіцьцё народнае гаспадаркі, індустрыялізацыя краіны працякаюць у кірунку павялічэньня ўдзельнае вагі і камандуючае ролі соцыялістычных форм гаспадаркі як у галіне вытворчасьці, так і ў галіне таваразвароту, за кошт прыватна-таварнага і капіталістычнага сэктару.

У той час, як капітальныя ўклады аграмаджанага сэктару народнай гаспадаркі: дзяржаўная і коопэрацыйная прамысловасьць транспорт, электрафікацыя і г. д. вырасьлі з 1.231 мільёну руб. у 1924-25 г. да 2.683 млн. у 1926-27 г., а ў 1927-28 г. уклады павінны вырасьці да 3.456 млн., што складае рост укладаў з 43,8 проц. у 1924-25 г. да 65,3 проц. у 1927-28 г.,—уклады неаграмаджанага сэктару народнай гаспадаркі ўвесь час падалі адносна і расьлі толькі нязначна ў абсолютных лічбах з 1.577 мільёнаў у 1924-25 г. да 1.717 мільёнаў у 1926-27 г., а ў 1927-28 г. павінны дайсьці да 1.836 млн., што дае падзеньне ўдзельнае вагі ўкладаў неаграмаджанага сэктару з 56,2 проц. у 1924-25 г. да 34,7 проц. у 1927-28 г.

У той час, як валавая продукцыя аграмаджанага сэктару прамысловасьці вырасла з 81 проц. у 1924-25 г. да 86 проц. усяе прамысловасьці ў 1926-27 г., а ў 1927-28 г. павінна павялічыцца да 86,9 проц.—роля неаграмаджанага сэктару прамысловасьці падала з году ў год (з 19 проц. продукцыі ўсяе прамысловасьці ў 1924-25 г. да 14 проц. у 1926-27 г., а ў 1927-28 г. павінны зьменшыцца да 13,1 проц.). Такое-ж адпіханьне прыватна-капіталістычных элемэнтаў мы маем і ў галіне таваразвароту краіны.

Вывад: краіна наша ідзе да соцыялізму ўпэўнена і шпарка, адпіхаючы на задні плян і выпіхаючы крок за крокам з народнай гаспадаркі капіталістычныя элемэнты. Гэты факт ускрывае перад намі асноўныя пытаньні: хто каго?

Цяпер мы можам сказаць, што ў асноўным у гэтай галіне мы маем ужо рашаючыя посьпехі. Не прызнаваць гэтага могуць хіба толькі сьляпыя ці звар'яцелыя.

Але цяпер пытаньне «хто каго» пераносіцца з галіны гандлю ў галіну вытворчасьці, у галіну вытворчасьці саматужнае, у галіну вытворчасьці сельскагаспадарчае, дзе прыватны капітал мае сваю пэўную ўдзельную вагу і адкуль яго трэба сыстэматычна зжываць.

Задача партыі: пашыраць і ўмацняць нашы соцыялістычныя камандныя вышыні ва ўсіх галінах народнае гаспадаркі як у горадзе, так і ў вёсцы, трымаючы курс на ліквідацыю капіталістычных элемэнтаў у народнай гаспадарцы.

(Працяг на 3 староны).



ВЫНІКІ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАУНІЦТВА.

Працяг дакладу І. В. Сталіна аб дзейнасьці Цэнтральнага Камітэту ЎсеКП(б).

САВЕЦКІ САЮЗ ШПАРКІМ КРОКАМ ІДЗЕ ДА СОЦЫЯЛІЗМУ.

Дзяржаўная гаспадарка і гандаль з кожным годам усё больш выціскае прыватны капітал з яго позіцый. За апошнія два гады прыватна-капіталістычны зварот у народнай гаспадарцы краю падае ня толькі адносна, але і абсолютна.

Нябывалы тэмп разьвіцьця нашай прамысловасьці.

Калі ўзяць валавую продукцыю ўсяе прамысловасьці краіны, і буйнай (дзяржаўнай і прыватнай), і дробнай, — гаворыць далей т. Сталін,—дык штогодны сярэдня-арытмэтычны прырост продукцыі па пяцігадовае наметы Дзяржплану складзе каля 12 проц., што дасьць павялічэньне ўсяе прамысловае продукцыі ў 1931-32 г. амаль на 70 проц. у параўнаньні з даваенным узроўнем. Процант штогодняга прыросту продукцыі нашае соцыялістычнае прамысловасьці, а таксама продукцыі ўсяе прамысловасьці ёсьць рэкордны процант, якога ня мае ніводная буйная капіталістычная краіна ў сьвеце. Па тэмпе свайго разьвіцьця наша прамысловасьць наогул, наша соцыялістычная прамысловасьць асабліва выпярэджвае разьвіцьцё прамысловасьці капіталістычных краін.

Гэты нябывалы тэмп разьвіцьця нашай буйной прамысловасьці тлумачыцца, па-першае, тым што яна ёсьць прамысловасьць нацыяналізаваная; па-другое, тым што яна ёсьць самая буйная і самая сконцэнтраваная прамысловасьць з усіх існуючых прамысловасьцяй у сьвеце.

Па-трэцяе, тым, што дзяржава, трымаючы ў сваіх руках нацыяналізаваны транспорт, нацыяналізаваны крэдыт, нацыяналізаваны замежны гандаль, агульна дзяржаўны бюджэт, мае ўсе магчымасьці кіраваць нацыяналізаванай прамысловасьцю ў плянавым парадку, як адзінаю прамысловаю гаспадаркаю.

Па-чацьвертае, тым, што нацыяналізаваная прамысловасьць як самая буйная і самая магутная прамысловасьць, мае ўсе магчымасьці праводзіць політыку няўхільнага зьніжэньня сабекошту, зьніжэньня адпускных цэн і патаненьня свайй продукцыі.

Па-пятае, тым, што нацыяналізаваная прамысловасьць можа разьвівацца ў абставінах паступовага зьбліжэньня паміж горадам, і вёскай у процівагу капіталістычнай прамысловасьці. якая разьбіваецца ва ўмовах нарастаючай варожасьці паміж буржуазным горадам, які выцягвае сокі ў сялянства, і паміж вёскай, што разбураецца.

Урэшце, тым, што нацыяналізаваная прамысловасьць апіраецца на рабочую клясу, як на гегемона ўсяго нашага развіцьця, з прычыны таго, яна мае магчымасьць з большай лёгкасьцю разьвіваць тэхніку наогул, продукцыйнасьць працы ў прыватнасьці, і прыстасоўваць рацыяналізацыю вытворчасьці і кіраўніцтва, маючы падтрыманьне з боку шырокіх мас рабочае клясы, чаго няма і ня можа быць пры капіталістычнай сыстэме прамысловасьці. Нябывалы тэмп разьвіцьця нашай соцыялістычнай прамысловасьці ёсьць просты і бязумоўны довад перавагі савецкай сыстэмы вытворчасьці перад сыстэмай капіталістычнай. Задача партыі: замацаваць дасягнуты тэмп развіцьця соцыялістычнай прамысловасьці і ўмацніць яго ў бліжэйшым будучым для стварэньня спрыяючых умоў, якія неабходны дзеля таго, каб дагнаць і перагнаць перадавыя капіталістычныя краіны.

Павольны рост продукцыі сельскае гаспадаркі.

У вёсцы, наадварот, мы маем параўнаўча павольны рост продукцыі.

Павольны тэмп развіцьця сельскае гаспадаркі ў параўнаньні з тэмпам разьвіцьця нашай нацыяналізаванай прамысловасьці тлумачыцца як надмернай адсталасьцю нашай сельска-гаспадарчай тэхнікі і занадта нізкім узроўнем культурнага стану вёскі, так асабліва і тым, што наша сельска-гаспадарчая вытворчасьць не нацыяналізавана і не аб'яднана, распылена і раскідана па кавалачка не вядзецца ў плянавым парадку і надпарадкавана пакуль што ў вялізнай сваёй часьці стыхіі дробнае вытворчасьці, не аб'яднана і ня ўзмоцнена на лініі колектывізацыі, з прычыны чаго прадстаўляе яшчэ выгаднае поле для эксплёатацыі з боку кулацкіх элемэнтаў.

Дзе выхад для сельскае гаспадаркі? Можа быць у замаруджваньні тэмпу разьвіцьця нашай прамысловасьці наогул, нашай нацыяналізаванай прамысловасьці ў прыватнасьці? Ні ў якім выпадку. Гэта было-б самай рэакцыйнай антыпролетарскай утопіяй (галасы: „Правільна“).

Нацыяналізаваная прамысловасьць павінна і будзе разьвівацца прысьпешаным тэмпам. У гэтым гарантыя нашага праходжаньня да соцыялізму. У гэтым гарантыя таго, што будзе, урэшце, індустрыялізавана сама сельская гаспадарка. Дзе-ж выхад? Выхад у тым, каб дробныя і найдрабнейшыя сялянскія гаспадаркі паступова, але няўхільна, не ў парадку націску, а ў парадку паказу і пераконаньня аб'яднаць у буйныя гаспадаркі на аснове грамадзкай таварыскай колектыўнай апрацоўкі зямлі з ужываньнем с.-г. машын і трактараў, з прыстасаваньнем навуковых прыёмаў інтэнсыфікацыі земляробства.

Партыяй ў гэтым напрамку за два гады зроблена нямала, але далёка яшчэ ня ўсё, што можна было-б зрабіць.

Ленін гаварыў на Х-м зьезьдзе, што ў нас няма яшчэ фондаў, неабходных для надпарадкаваньня сельскай гаспадаркі дзяржаўнаму ці колектыўнаму пачатку. Я думаю, што цяпер гэтыя фонды ў нас будуць і яны павінны ўзрастаць з цягам часу.

У якасьці прыкладаў, як саўхозы дапамагаюць часамі сялянам перайсьці на колектыўную апрацоўку зямлі з вялізарнаю выгадаю для сялян, тав. Сталін паказвае на дапамогу аб'яднаньня украінскіх саўхозаў трактарамі сялянам Адэскага раёну і чытае надрукаваны нядаўна ў нумары 267 „Известий“ ліст гэтых сялян з удзячнасьцю за зробленую дапамогу.

Больш-бы такіх прыкладаў,—гаворыць т. Сталін,—і тады можна было-б пасунуць гэту справу далёка ўперад.

Задача партыі: пашыраць ахоп сялянскае гаспадаркі коопэрацыяй і дзяржаўнымі органамі па лініі збыту і забесьпячэньня і паставіць чарговай і практычнай задачай нашага ўраду ў вёсцы паступовы перавод распыленых сялянскіх гаспадарак на рэйкі аб'яднаных буйных гаспадарак, на грамадзкую колектыўную апрацоўку зямлі на аснове інтэнсыфікацыі і машынізацыі земляробства ў разьліку, што такі шлях разьвіцьця зьяўляецца найважнейшым сродкам прысьпяшэньня тэмпу разьвіцьця сельскае гаспадаркі і перамаганьня капіталістычных элемэнтаў у вёсцы.

Такія ў цэлым вынікі і дасягненьні ў галіне гаспадарчага будаўніцтва. Гэта ня значыць, што ў нас усё абстаіць добра ў гэтай галіне. Не, у нас далёка ня ўсё абстаіць добра.

Ценевыя бакі гаспадарчага будаўніцтва.

У нас ёсьць, напрыклад, элемэнты таварнага голаду. Гэта—мінус у нашай гаспадарцы. Але мінус пакуль яшчэ, нажаль, няўхільны. Ёсьць людзі, напрыклад, наша опозыцыя, якія чарпаюць матар'ялы для сваёй ідэялёгіі ў спэкулянцкіх пластох і крычаць аб таварным голадзе, патрабуючы разам з тым „звыш індустрыялізацыі“. Але гэта недарэчнасьць, таварышы. Так могуць гаварыць толькі несьвядомыя.

Мы ня можам і не павінны згортваць цяжкую індустрыю дзеля ўсямернага разьвіцьця лёгкае прамысловасьці. Дый лёгкую прамысловасьць немагчыма разьвіваць у выстарчальнай меры без паскоранага разьвіцьця цяжкое індустрыі.

Можна было-б павялічыць завоз гатовых тавараў і заткнуць тавім чынам таварны голад, на чым нейкі час настойвала опозіцыя. Але гэта такое глупства, ад якога павінна была адмовіцца опозіцыя.

Другое пытаньне, наколькі ўмела вядзецца ў нас справа зьмякчэньня элемэнтаў таварнага голаду, што зусім магчыма ў нашых умовах і на чым заўсёды настойвала партыя.

Я думаю, што іменна ў гэтай галіне ня ўсё ў нас абстаіць добра.

Далей, мы маем такі факт, як параўнаўча немалую колькасьць капіталістых як у галіне прамысловасьці, так і ў галіне гандлю. Удзельная вага гэтых элемэнтаў не такая ўжо малая, як гэта часамі паказваюць у нас некаторыя та-



варышы. Гэта таксама мінус у балянсе нашае гаспадаркі.

Мне вядома, напрыклад, што ў галіне саматужнае прамысловасьці наогул, у галіне скураное і тэкстыльнае прамысловасьці ў прыватнасьці, есьць немалая колькасьць новых мільянэраў, якія паднявольваюць сабе саматужнікаў і наогул дробных вытворцаў. Ці ўсё робіцца, каб акружыць і выціснуць эномічна гэтыя эксплёататарскія элемэнты? Наўрад ці можна сумнявацца ў тым, што далёка ня ўсё робіцца ў гэтай галіне. А між тым гэта пытаньне мае для нас сур'ёзнейшае значэньне. Мы маем далей поўны рост кулацтва ў вёсцы. Гэта мінус у балянсе нашае гаспадаркі. Ці ўсё робіцца, каб абмежаваць і ізаляваць экономічна кулацтва?

Я думаю, што ня ўсё.

Ня маюць рацыі тыя таварышы, якія думаюць, што можна і трэба пакончыць з кулаком у парадку адміністрацыйных мер, праз ДПУ: сказаў, прылажыў пячатку і кропка. Гэты сродак лёгкі, але далёка не сапраўдны. Кулака трэба ўзяць мерамі экономічнага парадку, на аснове рэволюцыйнае законнасьці. А рэволюцыйная законнасьць ня есьць пустая фраза. Гэта не выключае, зразумела, ужываньня некаторых неабходных адміністрацыйных мер супроць кулака. Мы маем далей такі факт, як надзвычайна павольны тэмп зьніжэньня сабекошту ў прамысловасьці, адпускных цэн на прамысловыя тавары і, асабліва, розьнічных цэн на гарадзкія тавары.

Гэта таксама мінус у балянсе нашага гаспадарчага будаўніцтва.

Нельга не адзначыць, што мы маем тут вялізнае супраціўленьне апарату і дзяржаўнага, і коопэрацыйнага, і партыйнага. Нашы таварышы, як відаць, не разумеюць, што політыка зьніжэньня цэн на промтавары зьяўляецца адным з асноўных вагароў палепшаньня нашае прамысловасьці, пашырэньня рынку і ўзмацненьня тэй самай крыніцы, на базе якое можа толькі разгортвацца наша індустрыя.

Наўрад ці можна сумнявацца, што толькі шляхам бязьлітаснае барацьбы з гэтай інэртнасьцю апарату, гэтым супраціўленьнем апарату ў справе правядзеньня політыкі зьніжэньня цэн можна будзе ліквідаваць гэты мінус.

Нарэшце, мы маем такія мінусы, як гарэлка ў бюджэце, вельмі павольны тэмп разьвіцьця замежнага гандлю і недахват рэзэрваў. Я думаю, што можна было-б пачаць паступовае згортваньне гарэлкі, уводзячы ў справу, замест гарэлкі, такія крыніцы прыбытку, як радыё і кіно.

Што датычыць замежнага гандлю, дык мне здаецца, што рад труднасьцяй, якія мы маем у галіне гаспадаркі, упіраецца ў невыстарчальнасьць экспорту. Ці ўсё робіцца, каб шырока разгарнуць экспорт? Я думаю, што ня ўсё.

Такія ценевыя бакі нашага гаспадарчага будаўніцтва, на якія трэба зьвярнуць увагу і якія трэба ліквідаваць як-бы там ні было.

Уздым матар'яльнага ўзроўню рабочае клясы і сялянства.

Ад пытаньняў аб гаспадарчым становішчы краіны т. Сталін пераходзіць да пытаньняў аб політычным становішчы.

Асоб наёмнае працы (ня лічачы беспрацоўных) было ў 1924-25 г. 8.215.000, у 1926-27 г.—10.346 тыс. Прырост у 25 проц. З іх рабочых фізычнае працы, уключаючы сельска-гаспадарчых і сэзонных у 1924-25 г. было 5.448.000, у 1926-27 г. — 7.060.000. Прырост у 29,6 проц. З іх рабочых буйное прамысловасьці — у 1924-25 г. было 1.794.000, у 1926-27 годзе—2.338.000 Прырост у 33 проц.

Рэальная зарплата рабочых па ўсёй дзяржаўнай прамысловасьці, без налічэньняў, складала ў 1924-25 г.—25,18 пр. маскоўскіх умоўных р. у месяц, у 1926-27 г. —32,14 руб., што дае павялічэньне за 2 гады на 27,7 проц. і перавышае даваенны ўзровень на 5,4 проц. З налічэньнямі (соцстрах, культпатрэбы, комунальныя паслугі і інш.) зарплата складала ў 1924-25 г.—101,5 проц. ад даваеннага, а ў 1926-27 годзе—128,4 пр. ад даваеннага.

Фонды соцыяльнага страхаваньня вырасьлі з 461 млн. руб. у 1924-25 г. да 852 мільёнаў руб. у 1926-28 г., г. зн. па 85 проц., што дало магчымасьць правесьці праз дамы адпачынку і санаторыі 51.000 чал., забясьпечыць дапамогаю 460.000 беспрацоўных і 700 т. пэнсыянэраў (інвалідаў працы і грамадзянск. вайны) і выдаваць хворым рабочым за пэрыод хваробы поўны заработак.

Усяго за тры мінулыя гады на рабочае кватэрнае будаўніцтва, без індывідуальнага, выдана па лініі прамысловасьці, транспорту, выканкомаў і коопэрацыі 644,7 млн р., а разам з назначэньнем на 1927-28 год 1 мільярд 36 млн. р.

Асыгнаваньні за тры гады дазволілі адбудаваць 4.594.000 кв. мэтраў кватэрнае плошчы, забясьпечыць 267.000 рабочых, разам з сем'ямі каля 900.000 чал.

Паводле даных Наркампрацы, лік беспрацоўных вырас за 2 гады з 950.000 да 1.048.000. З іх індустрыяльных рабочых 16,5 проц., асоб-жа інтэлігентнае працы і не кваліфікаваных—74 проц.

Такім чынам, беспрацоўе наша мае асноўнай сваёй крыніцай перанасяленьне вёскі і толькі пабочнай сваёй крыніцай некаторую насычанасьць нашае прамысловасьці пэўным мінімальным складам індустрыяльных рабочых.

Вынік: бясспрэчны ўздым матар'яльнага ўзроўню рабочае клясы ў цэлым.

Задача партыі: працягваць лінію на далейшае палепшаньне матар'яльнага і культурнага становішча рабочае клясы, на далейшае павялічэньне зарплаты рабочае клясы.

Пераходзячы да пытаньня аб сялянстве, т. Сталін зазначае, што прыбыткі сялянскага насельніцтва раўняліся два гады назад, у 1924-25 годзе, 3.548.000.000 рублёў; у 1926-27 г. гэтыя прыбыткі вырасьлі да 4.792.000.000 руб., г. зн. на 35,1 проц. пры росьце сялянскага насельніцтва за гэты пэрыод усяго на 2,38 проц.

Гэта бясспрэчны паказальнік таго, што ў вёсцы праходзіць палепшаньне матар'яльнага становішча насельніцтва.

Дапамога працоўнаму сялянству ад дзяржавы ў 1925-26 г. складала 373 мільёны руб., у 1926-27 г.—427 мільён. р. Спэцыяльная дапамога вясковай беднаце ў 1925-26 г. складала ўсяго 91 міл. руб.

Спэцыяльная дапамога вясковай беднаце за 1926-27 г. складала ўсяго каля 100 млн. руб. Вынік: палепшаньне матар'яльнага становішча асноўных мас сялянства.

Задача партыі: працягваць лінію на далейшае палепшаньне матар'яльнага і культурнага становішча асноўных мас сялянства і, перш за ўсё, сялянскай бедньаты, узмацняць союз рабочае клясы з сялянствам, узьнімаць аўторытэт рабочае клясы і яе партыі ў вёсцы.

Аб бюрократызме.

Аб бюрократызьме,—гаворыць далей тав. Сталін,—гавораць так многа, што няма патрэбы доўга гаварыць аб гэтым. Слабасьць нашага дзяржапарату—у наяўнасьці бюрократычных элемэнтаў у ім, якія псуюць і скажаюць яго работу. Каб выгнаць з яго бюрократызм, трэба абнаўляць яго за кошт новых адданых справе рабочае клясы людзей, перарабляць яго ў духу комунізму, а не ламаць яго, а не разьвінчваць яго. Ленін тысячу раз меў рацыю, калі ён гаварыў:

„Без апарату мы-б даўно загінулі. Без сыстэматычнай упартай барацьбы за паляпшэньне апарату мы загінем да стварэньня базы соцыялізму“.

Ілюструючы некалькімі яскравымі прыкладамі «матушку-валакіту» і выпадкі «задвиженства», тав. Сталін паказвае на недапушчальнасьць такіх бясчынстваў і рэзюмуе: задача партыі заключаецца ў тым, каб змагаючыся супроць бюрократызму і за паляпшэньне дзяржапарату, выпальваць гарачым жалезам такія бясчынствы ў нашай практыцы.

Самым пэўным сродкам супроць бюрократызму зьяўляецца ўзьняцьце культурнага ўзроўню рабочых і сялян, які дасьць магчымасьць жаданьня, уменьня кантралюваць дзяржапарат зьнізу сіламі самых рабочых мас. У гэтым сэнс і значэньне ленінскага лёзунгу аб культурнай рэволюцыі.

Вось што гаварыў наконт гэтага Ленін у сакавіку 1922 г. перад адчыненьнем XI-га зьезду нашай партыі ў сваім лісьце ЦК на імя тав. Молатэва:

«Галоўнае, чаго нам не хапае—культурнасьці, уменьня кіраваць. Экономічны і політычны нэп зусім забясьпечвае нам магчымасьць пабудаваньня фундамэнту соцыялістычнай экономікі. Справа толькі ў культурных сілах пролетарыяту і яго авангарду».

Гэтых слоў Леніна нельга забываць таварышы (галасы: «Правільна»).

Адгэтуль задача партыі—узмацніць барацьбу за культурны ўздым рабочае клясы і працоўных пластоў сялянства.

Вынікі.

А які вынік па лініі ўнутранога політычнага становішча нашай краіны? Вынік такі, што савецкая ўлада зьяўляецца самаю моцнаю ўладаю з усіх існуючых у сьвеце ўлад. (Гучныя аплёдысмэнты). Але гэта яшчэ ня значыць, што ў нас усё гэтай галіне абстаіць добра.

У нас ёсьць, па-першае, беспрацоўе Гэта ёсьць мінус, які мы павінны перамагчы, прынамсі давесьці да мінімуму за што-б та ні стала. У нас ёсьць, па другое, недахопы ў кватэрным будаўніцтве для рабочых, кватэрны крызіс, які мы таксама павінны перамагчы, ці прынамсі давесьці да мінімуму ў бліжэйшыя гады.

У нас маюцца некаторыя расткі антысэмітызму ня толькі ў пэўных колах сярэдніх пластоў, але і сярод пэўнай часткі рабочых і нават сярод некаторых зьвеньняў нашай партыі. З гэтым злом трэба змагацца, таварышы бязьлітасна.

У нас маецца яшчэ такі мінус, як паслабленьне антырэлігійнае барацьбы. У нас маецца урэшце, страшэнная культурная адсталасьць ня толькі ў шырокім сэнсе гэтага слова, але і ў вузкім яго сэнсе у сэнсе элемэнтарнай граматы, бо процант няпісьменнасьці ў СССР усё яшчэ не малы. Усе гэтыя і падобныя ім мінусы павінны быць ліквідаваны, калі мы хочам ісьці наперад больш ці менш прысьпешаным тэмпам.

У заключэньне гэтага разьдзелу свайго справаздачы тав. Сталін, закрануўшы тры назначэньні за справаздачны пэрыод, якія маюць паказальнае значэньне, гаворыць:

— Вы ведаеце, што старшынёю ВСНГ РСФСР зацьверджаны тав. Лобаў. Гэта рабочы-мэталісты. Вы ведаеце, што старшынёю Моссавету абраны замест Каменева тав. Уханаў—рабочы мэталісты. Вы ведаеце таксама, што старшынёю Ленінградзкага савету абраны замест Зіноўева тав. Камароў, таксама рабочы—мэталісты.

Значыць, «лёрд-мэрамі» абедзьвюх сталіц зьяўляюцца ў нас рабочыя-мэталісты (*аплёдысмэнты*). Праўда, яны не з дваран, але кіруюць гаспадаркаю сталіц лепш за ўсякіх дваран (*аплёдысмэнты*). Вы скажаце, што гэта ёсьць тэндэнцыя мэталізацыі. Я думаю, што ў гэтым няма нічога дрэннага (галасы: «*Наадварот, вельмі добра*»).

Пажадаем капіталістычным краінам, пажадаем Лёндану, пажадаем Парыжу таго, каб яны дагналі нас урэшце, і выставілі ў «лёрд-мэры» сваіх уласных мэталістых (*аплёдысмэнты*).

(Працяг у наступным нумары)



Чаму комуністыя і комсамольцы ня верацъ у бога?

МАТАР'ЯЛ ДЛЯ ДАКЛАДАЎ І ГУТАРАК АБ КАЛЯДАХ.

... Сучасны сьвядомы рабочы, выхаваны буйнай фабрычнай прамысловасьцю, адукаваны гарадзкім жыцьцём, з агідай акідвае ад сябе рэлігійныя забабоны, прадстаўляе неба ў распараджэньне папоў і буржуазных глупцоў, заваёўвае сабе лепшае жыцьцё тут, на зямлі.

ЛЕНІН.

Усёведаючы, усёмагучы.

— «Падай, госпадзі!»—з такімі ці ім падобнымі словамі веруючыя зьвяртаюцца да бога. Дзесьці там высока—высока над зямлёй лётае бог, які ўсё бачыць, у якога ўсё ёсьць і які ўсё можа зрабіць.

Так гадаюць тыя, што веруюць у бога.

Што-ж гэта за бог, які ўсё мае? Што-ж гэта за госпадзь, які ўсё рабіць можа?

Слова бог—паходзіць ад слова багаты, а госпадзь—ад слова гаспадзін. Значыцца, госпадзь бог—гэта тое-ж самае, што і **багаты гаспадзін.** У яўрэйскай рэлігіі бог так і завецца: «гаспадзін мой», або «гаспадзін сьвету».

У нашых паўдзікіх прэдкаў, якія жылі за шмат тысяч гадоў да нас, зарадзілася вера, што **сьветам кіруюць адзін ці некалькі гаспод.** І ўраджай, і засуха, і лета з зімою, і нараджэньне людзей і жывёлы—усё адбываецца за ведамам багоў. І гэта вера, што сьветам правіць госпадзь, захавалася ад самых старажытных часоў, ад паўдзікіх людзей і дайшла аж да нашых часоў.

Зараз ва многіх дзяржавах, апрача савецкіх рэспублік, правяць гасподы. Іх—багатых гаспод—вельмі мала. **Працоўных—ва шмат разоў больш.** І каб гэта большасьць цярпела ўладу багатых гаспод, буржуазія так навучае народ: **«на сьвеце ёсьць бог; гэта ён зрабіў так, каб былі бедныя і багатыя. А па гэтаму трэба падначальвацца існуючым парадкам».**

Такім чынам, веру ў госпада бога скарыстоўвае буржуазія, каб **утрымаць у сваіх драпежных лапах уладу і панаваньне над працоўнымі.**

Па яўрэйскаму закону малітвы толькі адзін дзень у годзе—у «судны дзень» пападаюць проста к богу. У іншыя-ж дні—нельга надаядаць богу з рознымі драбніцамі. Гэта трэба рабіць праз яго блізкіх анёлаў, архангелаў, сьвятых.

Вера ў сьвятых зьявілася ў людзей у той час, калі на зямлі пачалі правіць князі.

Людзі бачылі, што каля правіцеляў увіхаецца цэлая армія слугаў, чыноўнікаў, саветнікаў. А з тае прычыны, што бог—**«цар над царамі цароў»**, дык у яго такіх слугаў куды больш. Гэта і ёсьць анёлы, архангелы, сьвятыя.

Царква налічвае да чатырохсот сьвятых, якія яшчэ завуцца ўгоднікамі. Хто-ж гэта за яны?

Вось, напрыклад, сьвятыя праваслаўнай царквы. **Сьвяты Аляксандр Неўскі.** Якога ён роду?—Князь. У сьвятыя папалі: сьвяты князь **Уладзімер**, сьвятая княгіня **Вольга**, князь **Андрэй Багалюбскі** і шмат хто іншы. За якія справы іх у сьвятыя залічалі?

Аляксандр Неўскі—**князь, ваяка, біўся з-за княства са сваімі братамі і клікаў на падмогу татар.** На іконах гэты сьвяты досыць часта намалёван ва ўвесь рост у вайсковай вопратцы, панцыры, у латах з мячом. Князь Уладзімер **хрысьціў Русь агнём і кроўю, руйнаваў непакорныя яму гарады, зьнішчаў усіх, хто не жадаў хрысьціцца.**

Якая-ж карысьць была ад таго, што князі, баяры, эпіскопы і іншыя з сьвету ўладыкаў абвяшчаліся сьвятымі? А карысьць вось якога парадку:

Незаўсёды сяляне ахвотна слухалі князёў, незаўсёды па добрай згодзе плацілі падаці. Чым-жа прывучылі людзей быць вернымі княству?

А тым, што князёў і баяр абвяшчалі сьвятымі. Калі памёршы князь сьвяты, значыць ён—**блізка да бога, можа з ім гутарыць.** А калі так—трэба слухацца князя, бо іх продкі, як сьвятыя і «радня божая», **могуць напакасьціць:** «гатовы перашкодзіць у рай папасьці».

Вось чаму князі і правіцелі так старанна залічалі ў сьвятыя сваіх памёршых прэдкаў, каб народ, молячыся памёршым князём—слухаўся тых, што жывуць і правяць.



„Добры хрысьціянін павінен слухацца духоўнікаў".

Ня сеюць і ня жнуць, а добра адзяваюцца і смашна ядуць.

Бог акружан цэлай арміяй анёлаў і сьвятых. Але ўсё гэта высока, на небе. Зьвярнуцца да божага прастолу з просьбай трэба умеючы, а то гатоў намалоць, наблытаць і нічога не атрымаецца.

Як- жа быць? **Для хадайніцтва перад богам маюцца асобныя людзі—папы, рабіны, мулы, ксяндзы, шаманы.** Яны ўжо ведаюць, як лепш да бога падкаціцца!

Гэтых «божых хадакоў» на зямной кулі—**сотні тысяч.** У Расіі, у першыя гады пасьля рэволюцыі, было зачынена **722** манастыры, у якіх знаходзілася **58** тысяч манахаў і манахінь. Ёсьць краіна—**Тыбет**, дзе амаль ўсе мужчыны—манахі.

Як жывуць гэтыя нябесныя птушкі? У самыя галодныя гады, калі мільёны людзей мерлі ад голаду, царкоўныя і манастырскія **склапы** былі завалены **запасамі харчу.**

А прыбыткі?

Мітрополіт маскоўскі меў прыбытку да **80** тысяч рублёў у год, петраградзкі атрымоўваў да **250** тысяч рублёў.

Быў час, калі манастырам належала трэцяя частка ўсяе зямлі. Усяго цэрквы манастыры мелі к 1905 году **два з паловаю мільёны дзесяцін зямлі.** На гэтай зямлі маглі-б жыць і працаваць паўмільёна серадняцкіх гаспадак.

Апрача зямлі, цэрквы, манастыры ўладалі і іншымі багацьцямі: фабрыкамі, заводамі, гасьцініцамі, рыбнай лоўляй і інш.

Царскі ўрад адпускаў штогодна сьвяцейшаму сіноду, які кіраваў праваслаўнай царквою Расіі, дзесяткі мільёнаў рублёў.

Глава ангельскай царквы атрымоўвае ў год сто тысяч рублёў.

Хіба сусьветная буржуазія так верыць у бога, што плаціць служкам «усявышняга» мільёны рублёў?

Далёка ня так. **Яна сама ня верыць.**

Буржуазія памятае добра адно, што **чым больш працоўныя будуць верыць у бога, тым спакайней будзе ёй жыцца.**

Чаму? А таму, што веруючыя пераконаны, што ўсё, што робіцца на зямлі, **гэта ад бога.**

Вось чаму буржуазія, хаця яна сама ні ў бога, ні ў чорта ня верыць, траціць на падтрыманьне веры вялікія грошы.

Для гэтай-жа мэты ў школах да рэволюцыі навучалі дзяцей таму, што завуць «законам божым». Якая ад гэтага «божага закону» карысьць? Каму?

А карысьць буржуазіі тая, што дзяцей з раньніх год вучылі паслухмянасьці богу і ўладам, хоць-бы гэта была ўлада цара і пана. «Закон божы» рыхтаваў пакорных рабоў з дзяцей рабочых і сялян.

Сьвята нараджэньня Хрыста.

Праваслаўныя хрысьціяне, сьвяткуючы каляды, думаюць, што яны гэтым самым сьвяткуюць дзень нараджэньня божага сына Ісуса Хрыста.

Сьвята каляд па-расійску завецца «Рождеством», па-яўрэйску «Ану-эль», па-французску «Ноэль». Яўрэйскае «Ану-эль» азначае ў перакладзе на нашу мову—«бог радзіўся».

Тое, што нават першыя хрысьціяне ня ведалі, ці быў Хрыстос на зямлі, як чалавек, і калі ён быў, дык калі ён радзіўся—даказвае тое, што ў першыя вякі пасьля зьяўленьня хрысьціянства, раджэньне Хрыста зусім не сьвяткавалася.



ІСУС:—Паважайце гаспадароў, якія вас ненавідзяць, прашчайце клясавым ворагам вашым, трымайцеся ў баку ад рэвалюцыі і бог благаславіць вас.

Раджэньне Хрыста на Захадзе пачалі сьвяткаваць толькі з 354 году, а на Ўсходзе — у Візантыйскай імпэрыі з 380 году. Адны сьвяткавалі раджэньне Хрыста 25-га сьнежня, а другія 6-га студзеня.

Якім-жа парадкам можна было сьвяткаваць адно і тое самае нараджэньне і 25-га сьнежня і 6-га студзеня ў адных і тых-жа мясцох.

Калі-ж час сьвяткаваньня нараджэньня аднаго і таго-ж бога адносілі да 25-га сьнежня і да 6-га студзеня, дык трэба зрабіць вывад, што ў першыя вякі пасьля зьяўленьня хрысьціянства праваслаўныя хрысьціяне ня ведалі нараджэньня свайго няіснуючага бога, а спраўлялі свае звычайныя паганскія сьвяты.

25-га сьнежня людзі паганскай веры у розных краінах сьвяткавалі дзень раджэньня сонца.

Дзень раджэньня Хрыста—дзень раджэньня ўсіх паганскіх багоў.

У гэты-ж дзень яны запальвалі агні. Запальваючы агні, зямля або імкнулася рознымі загаворамі зрабіць уплыў на сонца, якое было, па іх думцы, вялікім агнём, запаленым на небе.

Задоўга да зьяўленьня хрысьціянства ў розных паганскіх верах сыны божыя радзіліся ў часе павароту сонца з зімы на лета. Па поглядах сумэрыйцаў, у гэты час родзіцца бог Дузу (Таммуз у Вавілёне). Да таго-ж часу фінікіяне адносілі раджэньне свайго бога Адоніса, фрыгійцы—раджэньне іх бога Аттыса, пэрсыяне—раджэньне іх бога сонца Мітры, індусы — раджэньне бога агня Агні, грэкі — раджэньне Апалона і інш.

Чаму раджэньне багоў адносіцца к часу павароту сонца з зімы на лета.

Земляроб прыкмячае, што ў часе павароту сонца з зімы на лета дні павялічваюцца, што надыходзіць весна, другі год, і другімі словамі—як-бы адбываецца пералом у прыродзе. А пагэтаму ён лічыць сьвята павароту з зімы на лета адным з найбольшых сваіх сьвятаў, сьвятам раджэньня свайго бога. Хрысьціянская рэлігія не магла падняцца вышэй тых вытворчых адносінаў, якія былі ў часе яе зараджэньня. Як люстра, яна адбіла поўную залежнасьць будучага ўраджаю земляробаў ад стыхійных сіл прыроды.

Такім чынам, апавяданьне аб непарочным зачацьці Хрыста—паўторнае выданьне больш старадаўніх вымыслаў. Зразумела адсюль, што і падрабязнасьць усякае працэдуры і абраднасьці нараджэньня—запазычанасьць.

Пэрсыдзкі Мітра нарадзіўся ў пячоры і яму пакланяліся пастухі.

Грэцкі Зэўс радзіўся ў пячоры Іда ад багіні Рэі, іх прасьледуе Кронас. Эгіпэцкая Ізіда раджае Горуса на высьпе. Іх прасьледуе Цыфон.

Даўнія спрэчкі аб нараджэньні Хрыста.

У аднэй з адкапаных у горадзе Анціпуапалісе (Эгіпэт) магіле знойдзены яслі, якія ўжываліся для прадстаўленьня на сцэне жыцьця асірыйца, што вельмі напамінае наш беларускі «верцеп».

Хрысьціянскае царкоўнае сьвята нараджэньня Хрыста было ўстаноўлена ў чацьвёртым веку візантыйскім імпэратарам Феадосіем і эпіскапам Іоанам Златаустам у знак перамогі самадзяржаўя і царквы над арыянскай ерасьсю. У 379 годзе ў Канстантынопалі здарыўся дзяржаўны пераварот. На прастол уступіў імпэратар Феадосій, які стаяў на чале той часткі духавенства, якая прытрымлівалася нікейскага сымбалю і была супраціўніцай арыянскага вучэньня.

Пытаньне аб раджэньні Хрыста стаяла ў цэнтры спрэчак гэтых партый, якія пад рэлігійнымі розпагалосьсямі хавалі політычную барацьбу. Устанаўленьне сьвята нараджэньня было свайго роду рэлігійнаі дэмонстрацыяй супроць арыян, якія вучылі, што Хрыстос радзіўся не як бог, а як чалавек, і які ў далейшым стаў богам. У 380 годзе імпэратарскія ваенныя атрады на чале з эпіскопамі ўрадавай партыі напалі на арыянскія цэрквы і перабілі іх абаронцаў. Пасьля гэтага арыянскія цэрквы са ўсімі іх багацьцямі дасталіся эпіскапам, прыхільнікам імпэратара. У гэтым-жа годзе нараджэньне ўжо сьвяткуецца ва ўсіх цэрквах Канстантынопалю. Але народныя масы, якія падтрымлівалі арыянскую партыю, адмовіліся прысутнічаць пры гэтым богаслужэньні. Народ прышлося сілком заганяць у цэрквы. Пануючая партыя парашыла лічыць, што Ісус радзіўся богам і што, значыцца, патрэбен асобны дзень для адзнакі гэтага гістарычнага моманту.

Як бачым, якім прымусовым шляхам прыцягвалі да сьвяткаваньня каляд шырокія масы насельніцтва тыя «сьветлыя людзі», якім гэта было выгадна.

Хрысьціянскія каляды запазычалі, свае абрады ў язычаскіх сьвятаў, прыстасаваўшы іх да свайго вучэньня. А пагэтаму каляды захавалі многія рысы земляробскага сьвята: калядная куцьця, якая ставіцца напярэдадні нараджэньня Хрыста ў сена. Гэта мае агульныя рысы з прынашэньнем ахвяр будучаму ўраджаю.

Калядныя гаданьні па хлебе, зярняці, жывёле таксама паказвае на земляробчае паходжаньне сьвята. Той самы «баран», якога часта гуляе наша вясковая моладзь, таксама мае тыя самыя карані, што і папярэднія абрады.

Калі земляроб бачыў, што сьвірэпыя маразы яго пакідаюць, што яму менш заставалася чакаць новага ўраджаю—усёй сям'ей весяліўся, сьпяваў. А ад гэтага і пайшлі валачобнікі, елка і каляднае парасё, хаджэньне са зьвяздой.

Сьвята каляд толькі знадворным выглядам зьвязана з хрысьціянствам. На самай справе яно зьяўляецца чыста земляробчым сьвятам, якое прыстасавана для падтрыманьня ў інтарэсах капіталістых рэлігійнасьці народаў.

„На бога надзейся, а сам не плашай".

У комуністых і комсамольцаў веруючыя часта пытаюць:

— Чаму вы супроць бога? Што ён вам мяшае? У вас свая рэлігія—комунізм, у нас—свая. Мы вам не мяшаем і вы нам не мешайце. Якая вам справа да таго, што я ў бога веру?».

Другія кажуць яшчэ і так:

— «Калі вы бралі ўладу, абяцалі свабоду сумленьня, свабоду веры. Адлучылі царкву ад дзяржавы. Абяцалі ў справы царкоўныя ня ўмешвацца, а самі што робіце?»

Мы змагаемся ня з веруючымі, а з самою вераю.

Адкажам спачатку самым сабе на пытаньне: **што мы робім, як праводзім антырэлігійную работу?**

Мы друкуем у часопісях і газэтах артыкулы, у якіх заклікаем рабочых і сялян ня верыць у бога; крытыкуем і веру і бога; у час вялікіх сьвят наладжваем дэмонстрацыі і мітынгі супроць веры (напрыклад, комсамольскія каляды і вялікдзень); наладжваем дыспуты, у якіх стараемся даказаць, што бога няма; вынесьлі з усіх установаў іконы і забаранілі іх там трымаць; забаранілі выкладаньне закону божага ў школах.



Поп у царскай школе.

Наогул, робім усё, што толькі можам, каб **зрабіць з рабочай і сялянскай моладзі актыўных бязбожнікаў.** Хіба гэта не барацьба? Бязумоўна, барацьба, ды барацьба адважная.

Ні на хвілінку ня трэба забывацца, што **мы змагаемся ня з веруючымі, а з самою вераю.**

Намі была-б зроблена вялікая памылка, калі-б мы, комуністы і комсамольцы, якія яшчэ ўчора разам з рабочымі і сялянамі сядзелі ў акопах, перамагалі белагвардзейцаў для таго, каб рабочым і сялянам жыць палепшала, пачалі-б зараз змагацца з веруючымі рабочымі і сялянамі. Не, ня з веруючымі мы змагаемся. А вось вера—гэта іншая справа. З верай сапраўды трэба змагацца ўсімі мерамі, усімі спосабамі, каб толькі асіліць і перамагчы.

Мы разглядаем веру, **як вельмі брыдкую, заразьлівую хваробу.** Калі чалавек моцна хворы, дык ня толькі рабіць, але і дагледаць за сабою ня можа. Тое-ж самае і з вераю. Калі чалавек верыць у бога, дык ня можа змагацца за свае правы, таму што вера прымушае яго спадзявацца, верыць, цярпець і пакарацца.

І тым больш трэба з вераю змагацца, што ёю хвараюць пераважна рабочыя і сяляне, якіх мы заклікаем да барацьбы.

Для таго, каб выразьней зразумець, якую шкоду прыносіць рэлігія, прывядзем некалькі прыкладаў.

У сьвяшчэнным пісаньні сказана, што „несть власть, аще не от бога" (няма такой улады, якая была-б не ад бога), або „шануй і слухайся свайго начальства".

Веруючыя так і робяць; пры цары гэта перашкаджала ім разгадаць простую мэханіку царскага самадуру і ўзьняць на цара дубінку. А пры савецкай уладзе веруючыя—горшыя нашы памоцнікі, бо яны баяцца распачаць барацьбу супроць бюрократызму некаторых нашых мясцовых органаў.

Другі прыклад.

У сьвяшчэнным пісаньні сказана: ня імкніся **ніколі нічога ведаць.** Веды—шкодны. **Лепш надзейся на бога, ды мацней веруй.**

А што з гэтага выходзіць?

Захварэла ў аднэй вёсцы у аднаго беднага селяніна карова. Павёў ён яе да знаючага чалавека—да вэтэрынара. Той паглядзеў, падумаў і кажа: „Карова чумою захварэла. Трэба зараз-жа зарэзаць яе ды чым найглыбей закапаць. А то ўся жывёла паздыхае". Не паверыў селянін знаючаму чалавеку: пачакаю, мысьліць сабе, што будзе, тое і будзе. Можа, яшчэ і паправіцца. **Ужо богу як уздумаецца».** Пайшоў селянін у царкву, заказаў малебен сьвятому Ўласу (пакравіцелю жывёлы), паставіў рублёвую сьвечку. А здарылася так, як гаварыў вэтэрынар. Карова пахварэла-пахварэла ды здохла. Мала таго, што сама прапала, заразіла другую скаціну. І так разгулялася чума, што палова вёскі бяз жывёлы засталася. Так з-за веры ўся вёска беднай стала.

Вось чаму мы **змагаліся, змагаемся і будзем змагацца з рэлігіяй,** пакуль у нашай краіне не застанецца ніводнага веруючага ў бога рабочага і селяніна.

Вось таму народ, бачачы шмат гора і мукаў у жыцьці, стварыў пагаворку—**«На бога надзейся, але і сам не плашай».**

„ЧАМУ Я НЕ ВЫСТУПАЮ НА СХОДАХ ЯЧЭЙКІ?“

— „АКТЫЎ“ І „ПАСЫЎ“ У ЯЧЭЙКАХ.—УМЕЙЦЕ ПРАСЛУХАЦЬ ВЫСТУПЛЕНЬНЕ КОЖНАГА КОМСАМОЛЬЦА. —ЦІ ЁСЬЦЬ „МАЎКЛІВЫЯ“ Ў ТВАЁЙ ЯЧЭЙЦЫ І ЧАМУ ЯНЫ МАЎЧАЦЬ?—ЧЫМ ВЫЗНАЧАЕЦЦА АКТЫЎНАСЬЦЬ МОЛАДЗІ ! ЦІ ВАРТА КОМСАМОЛЬЦУ „АПУСКАЦЬ РУКІ“ ПЕРАД ЦЯЖКАСЬЦЯМІ?—

Чакаем водгукаў на ліст комсамольца Касьценкі.

„МАЎЧАЛІВЫЯ“, ЗАГАВАРЭЦЕ!

Сёньня мы зьмяшчаем ліст у рэдакцыю комсамольца Касьценкі. Пытаньне высуну-[та]е ім—хвалючае пытаньне, маючае грамадзкае значэньне. Аб гэтым гавораць і тыя вод-[гу]кі [не]каторых комсамольцаў, якія папярэдне азнаёміўшыся з лістом, прыслалі нам свае [д]умкі. Разам са значна павялічыўшайся актыўнасьцю працоўнай моладзі і комсамольцаў [м]ы часткова ў ячэйках, асабліва вясковых знойдзеце групу «маўчальнікаў».

Прычыны маўчаньня бываюць розныя: адны так-званыя „абываталі ў комсамоле“ маўчаць таму, што ня хочуць „умешвацца“, у якіх „хата з краю“; другія маўчаць таму, што «ня ўмеюць выказацца правільна», баяцца, каб над імі не пасьмяяліся.

А ці няма ў нас часткі такіх актывістых, якія ня толькі не прыслухоўваюцца, але нават насьмяхаюцца над „кравымі“ выступленьнямі, прапановамі „радавікоў“.

Ці ня сустракаюцца такія выпадкі, калі бюро ячэйкі за шматлікімі пасяджэньнямі, кампаніямі ня бачыць жывых людзей, з нецярплівасьцю чакаючых прыкладаньня сваёй ініцыятывы ў практычнай працы?

Такіх недарэчнасьцяй у працы асобных комсамольскіх ячэек шмат, аб гэтым гаворыць ліст Касьценкі і водгукі на яго. Нам з гэтымі момантамі трэба павесьці рашучую барацьбу.

Праўда, у лісьце Касьценкі ёсьць погляды, якія не адпавядаюць сапраўднасьці, і якія трэба Касьценку і шмат да яго подобным таварышам растлумачыць.

Ці праў Касьценка, калі ён перад недахопамі і цяжкасьцямі апускае рукі, нават „расчароўваецца ў комсамоле“? І ці зьмяраецца наогул актыўнасьць колькасьцю выступленьняў?

Абмеркаваньне ўзьнятага тав. Касьценкам пытаньня мы працягваем на старонках нашай газэты. Мы таксама раім абгаварыць яго на сходах комсамольскіх ячэек, у абедзенныя перапынкі на прадпрыемствах.

„Маўчальнікаў“-абываталяў у комсамоле не павінна быць, але таксама не павінна быць і казённых бюрократычна-пратакольных адносін да масы радавых комсамольцаў, да праяўленьня іх актыўнасьці ў якой-бы там ні было працы.

Чаму я не выступаю на сходах.

(Ліст комсамольца Касьценкі).

Паважаныя тарарышы!

Я доўга не адважваўся пісаць вам, але гэтае пытаньне так мяне мучыць увесь час, што я не магу аб ім маўчаць.

Я ўжо тры гады працую на заводзе. У комсамоле паўтара гады. Калі я ўступаў у організацыю, мне здавалася, што я, нарэшце, стаў ужо чалавекам. Я буду штосьці рабіць для грамады, я буду выступаць на сходах, я стану актывістым.

Але што мне рабіць, калі я вельмі баязьлівы, у тым сэнсе, што не адважваюся гаварыць. Рабіць то я буду ўсё, што трэба, а гаварыць—баюся. Мне заўсёды здаецца, што ў мяне нічога ня выйдзе, хлапцы будуць сьмяяцца.

Цэлы год пасьля падачы анкеты я ні разу ня выступіў на сходзе, але затое я добра сачыў, як выступаюць іншыя. І мне было дзіўна, чаму, калі гавораць актывісты, усе іх слухаюць, апладыруюць ім, а калі выйдзе радавы хлапец—на сходзе толькі сьмех і шум.

Я над гэтым доўга думаў і рашыў: давай я паспрабую выступіць.

Нарэшце, адбыўся сход. Была справаздача бюро. Я запісаўся першым, здаецца, але мне далі слова амаль у самым канцы. Чаму —я ня ведаю. Але, калі назвалі маё прозьвішча, я быў вельмі ўсхваляваны і, напэўна, гаварыў незразумела.

Хлапцы ўжо надта змарыліся, сьпяшаліся дахаты, крычалі: „раглямант, раглямант“. Кожную хвіліну мяне перарываў старшыня, каб супакоіць іх.

А калі я гаварыў аб тым, каб завесьці сшытак для запісу прапаноў комсамольцаў, хлапцы засьмяяліся і хтосьці крыкнуў:

— Бачыце, канцаляршчыну заводзіць, цяпер барацьба з цяганінай.

Я зусім зблытаўся і нават да канца не дагаварыў.

Чакаў я, што сэкратар ячэйкі адкажа мне ў заключным слове, але ён адказаў, толькі некалькім, а...

— Астатнія прапановы мы ўлічым у нашай штодзённай рабоце.

Я стаў чакаць, калі-ж „улічаць“ маю прапанову. Прайшоў тыдзень, другі, трэці—нічога ня зроблена. Я запытаў неяк сэкратара, што-ж будзе, але ён адмахнуўся:

— Што ты? Ня ведаеш, колькі зараз кампаній? Пазыка індустрыялізацыі, колдагавор... не ўцячэ твая прапанова.

І вось я пытаю вас, таварышы, ці правільна так? Якое-ж пасьля гэтага будзе ў радавога хлапца жаданьне выступаць?

Ня ведаю, як у іншых ячэйках, але ў нас знойдзецца каля 5 такіх хлапцоў і дзяўчат, якія ўжо па 2 гады ў комсамоле, а яшчэ ні разу ня выступалі. Як-жа яны навучацца выступаць перад беспартыйнай масай, калі на іх нават у ячэйцы ніхто не зварочвае ўвагі?

Калі я памыляюся—растлумачце мне, як павінна быць?

Я надта доўга думаў, ці варта пісаць аб гэтым. Мабыць у мяне гаворыць асабістая скарга, але ўсё-ж такі мне здаецца, раз такіх як я многа, значыць гэта пытаньне грамадзкае.

Прашу рэдакцыю, калі ліст ня будзе зьмешчаны, адказаць мне—чаму. Інакш я зусім расчаруюся ў комсамоле.

З комсамольскім прывітаньнем

А. КАСЬЦЕНКА.

Дзельнае слухаюць з ахвотай.

Ліст таварыша Касьценка закрануў, бязумоўна, балючае пытаньне, якое патрабуе неадкладнага вырашэньня. Такія зьявішчы, аб якіх піша тав. Касьценка,

сустракаюцца, але вельмі рэдка.

Хто-б ні гаварыў, яго выслухаюць з аднолькавай увагай. Калі радавы, не актывісты, унясе дзельную прапанову, дык я не сумняваюся, што яна будзе выслухана. Праўда, на сходах, часьцей за ўсё выступае азначаная група актывістых, але гэта ня значыць, што не даюць гаварыць і радавіку.

Ці праў Касьценка, калі заяўляе, што больш ніколі не папросіць слова і што ён расчаруецца ў комсамоле?

Бязумоўна, такія адносіны да прапановы Касьценка, якія ён меў у сваёй ячэйцы, могуць, сапраўды, адбіць ахвоту выступаць у далейшым на сходах і нават могуць расчаравацца ў комсамоле.

Ю. БРАЦЛАЎСКІ.



Вучымся маўчаць

(Старасельская ячэйка, Копыльскага рэёну).

У нашай ячэйцы даклады робіць заўсёды сэкратар ячэйкі. Ніколі не даручаюць рабіць ці даклад, ці садаклад радавому комсамольцу.

У выніку чаго—на кожных сходах,—комсамольцы маўчаць. Яны баяцца выступаць у спрэчках, бо яны ня могуць «правільна» гаварыць.

Паміж іншым атрымоўваюцца нейкая надарэчнасьць: комсамольцы, а ня могуць выступіць на сходах сялян, беднаты. Трэба нам павесьці працу так, каб у ёй удзельнічала ўся маса комсамольцаў ячэйкі. Памойму, дык трэба даручаць адсталым хлапцом рабіць садаклад, дапамагаючы ім у гэтым.

Б Рэйгін

Можна гаварыць, але не рабіць.

Ці праў Касьценка, гаворачы аб тым, што ў нас на сходах не даюць гаварыць радавіку? Ці праў ён, калі зацьвярджае, што ніхто не зварачае ўвагі на прапановы радавых комсамольцаў?

Буду апэраваць фактамі з жыцьця нашай ячэйкі. У ячэйцы Акрфінаддзелу, агітпропкамісія вылучае з радавых комсамольцаў дакладчыкаў па асобных пытаньнях.

Прыкладна, на бліжэйшым сходзе стаіць пытаньне аб бюрократызьме. АПА-камісія даручыла групе таварышоў, сярод якіх маюцца радавыя комсамольцы, сабраць матар'ялы па гэтаму пытаньню і прыняць удзел у спрэчках па дакладу.

Ці заціраюцца радавыя комсамольцы? Не. У нашай ячэйцы ўсе, за выключэньнем займаючыхся ў школе, маюць па адной, дзьве і больш нагрузкі ці па комсамолу, ці па профэсыйнай працы. Ці можна гэта назваць „заціраньнем“ радавікоў? Не, нельга.

Значыць адсюль вынік, што, калі нават такая ненормальнасьць маецца ў ячэйцы, дзе знаходзіцца Касьценка, дык гэта адзіны альбо адзін з адзіных выпадкаў, а нікольні ня маючы масавы характар у нашай організацыі.

Ці вымяраецца актыўнасьць членаў організацыі выступленьнем на сходах? Ці праў Касьценка, што ен „расчаруецца“ у комсамоле?

Актыўнасьць кожнага асобнага комсамольца ні ў якім выпадку не зьмяраецца колькасьцю выступленьняў, а актыўнай практычнай працай у комсамоле, у профсаюзе і ў іншых грамадзкіх організацыях. Можна шмат гаварыць, але мала рабіць. І наадварот—мала гаварыць, але шмат рабіць. Вядома, лепш апошняе. Ці варта з-за ненормальнасьцяй у працы сваёй ячэйкі расчароўвацца ў комсамоле. Ці трэба гэта рабіць? Не, ня трэба. Трэба выпраўляць тыя ненормальнасьці, якія маюцца і заражджаюцца ў процэсе практычнай працы нашай організацыі.

Е. К.



Не расчароўвацца, а брацца за працу

Некаторыя моманты, высунутыя тав. Касьценка, бязумоўна, заслугоўваюць увагі. Факты я буду браць з ячэйкі Нархарч.

Ёсьць у нас комсамолка М., якая яшчэ ў 1924 годзе ўступіла ў комсамол. Яна малапісьменная. Добра ўладае яўрэйскай мовай і з тэй прычыны, што ячэйка вядзе сваю працу на расійскай мове, яна ня можа выступаць.

У асноўным склаўшаяся ў т. Касьценка думка аб комсамоле і аб адносінах да „радавікоў“—няправільная.

Касьценку здавалася, што ўступіўшы ў комсамол, ён штосьці будзе рабіць для грамады, будзе выступаць на сходах і будзе потым актывістым.

Няўжо за $1^1/_2$ гады прабываньня Касьценкі ў організацыі, ён нічога не зрабіў для грамады? Няўжо Касьценка не працуе ні ў аднэй грамадзкай організацыі?

Тав. Касьценка ня праў, калі гаворыць, што ён „расчаруецца“ ў камсамоле і больш ніколі не папросіць слова. Хай ён прыгледзіцца глыбей, хай пазнаёміцца лепш з працай комсамольскай організацыі тады ён упэўніцца, што жыцьцё ў комсамоле б'е крыніцай, і ня ныцьцем, а бадзёрым энтузіязмам мы з кожным днём заваёўваем і павялічваем наш уплыў на беспартыйную моладзь.

Кучар.

Баяўся, каб не пасадзілі ў галёшу.

Хоць ніколі ў газэты я не пісаў, але па пытаньні, паднятым тав. Касьценка, я рашыў усё-ж выказацца. Я пастараюся выкласьці свае думкі так, як умею.

У організацыі я ўжо 2 гады. Цяпер я актывіст, часта выступаю на сходах і прымаю ўдзел у ячэйковай працы. Толькі год назад, я амаль ніколі не выказваўся таму што баяўся, каб актывісты не пасадзілі мене ў галёшу. Вось чаму я лічу, што той выпадак, які апісвае тав. Касьценка, можа мець месца ў нашых ячэйках.

Возьмем хаця-б ячэйку працасьветы. З некалькі двесяткаў комсамольцаў выказваецца азначаная група таварышаў, а астатнія, сярод якіх шмат маладых комсамольцаў, вельмі рэдка, ці ніколі ня выступаюць.

Вельмі добра, што рэдакцыя падхапіла гэтае пытаньне на абгаварваньне моладзі. Магчыма, што такім чынам, мы зьнішчым гэты недахоп у нашай організацыі.

А. Лін.



Міжнародны агляд.

Дзень за днем.

Рабочыя Нямеччыны бастуюць.

Нямеччына зараз знаходзіцца ў хвалях шматлікіх забастовак.

Становішча працоўных увесь час значна пагаршаецца, націск фабрыкантаў, накіраваны да павялічэньня працоўнага дню і зьмяншэньня пэнсіі, атрымоўвае супраціўленьне з боку працоўных мас.

110 тысяч рабочых цыгарэтнай прамысловасьці спынілі працу, абвясьціўшы забастоўку супроць занадта вялікай эксплёатацыі. Забастоўшчыкі патрабуюць павялічэньня пэнсіі і тэрміновай адмены ўжо зробленай пастановы аб павялічэньні працоўнага дню.

Становішча гэтай часткі рабочых зразумелае. На перамогу над фабрыкантамі яны разьлічваць, пры цяперашніх умовах, у ніякім разе ня могуць, прымаючы пад увагу, што на складах знаходзяцца вялікія запасы цыгарэтаў.

Фабрыканты зусім адмаўляюцца задаволіць патрабаваньні рабочых, маючы магчымасьць спыніць працу фабрык на няпэўнаачаны час.

У Саарскай вобласьці (таксама ў Нямеччыне) забаставалі 18 тысяч мэталістых, якія патрабуюць павялічэньня заробку.

Кіраўніцтва гэтай забастоўкай (як і ў пераважнай частцы выпадкаў) узялі на сябе комуністыя.

Кіраўнікі-ж жоўтых профсаюзаў імкнуцца (таксама, як і заўсёды) спыніць забастоўку, падтрымліваючы пастанову так званага «трэцейскага суда» аб павялічэньні пэнсіі ўсяго на ўсяго на тры процанты.

Буржуазія Нямеччыны хоча: па-першае — задушыць рабочы рух унутры краіны і па-другое—стварыць цяжкасьці для Савецкага Саюзу.

Гэтымі днямі ў Нямеччыне выкрыта шайка фальшывамонэтчыкаў, якія выраблялі ў сваёй майстэрні штучныя чырвонцы. Праца фальшывамонэтчыкаў, акрамя мэты асабістага абагачэньня, была накіравана да зрыву курсу (расцэнкі) савецкіх грошай за межамі, а таксама для організацыі контр-рэволюцыйнай дзейнасьці белагвардзейцаў, як унутры Савецкага Саюзу, так і за межамі яго.

У гэтай цёмнай справе з вырабам штучных чырвонцаў прымалі ўдзел выдатныя дзеячы грузінскага меншавізму і іх прыхільнікі, як, напрыклад, кароль нафты Дэтэрдзінг і іншыя сусьветныя драпежнікі, якія дапамагаюць барацьбе супроць СССР.

Партызанскія атрады кітайскіх сялян.

Занадта ўзмацніўшыся за апошні час сялянскі рух у цэнтральным Кітаі мае, у сваю чаргу, таксама вялікае значэньне для ўсяго шляху рэволюцыйных здарэньняў у Кітаі.

Шматмільённыя масы сялян, ня маючыя магчымасьці мірна займацца сваёй гаспадаркай, прыгнечаныя генэраламі-абшарнікамі і цяжкімі палаткамі ўсё больш і больш рэволюцыянізуюцца і ўцягваюцца ў вызваленчы рух. Лепшым прыкладам гэтага палявеньня сялянства Кітаю можа зьявіцца сялянска-партызанскі рух, які з кожным днём пашыраецца і мацнее. Кіруючую ролю ў гэтых партызанскіх атрадах адыгрываюць комуністыя, але-ж без аб'яднанага асяродку ў гэтым кіраўніцтве. Аб моцы партызанскіх атрадаў сьведкамі могуць быць цэлы шэраг перамог нават над сталымі («рэгулярнымі») часткамі кітайскай арміі.

Кожны дзень тэлеграф прыносіць новыя весткі аб гвалтах генэралаў над цёмнымі масамі кітайскага сялянства. Гэтыя зьдзекаваньні яшчэ больш павялічваюць злосьць працоўных вёскі супроць землеўласьнікаў, заклікаючы іх на рашучую барацьбу за сваё аслабаненьне. На фронце барацьбы працоўных Кітаю зараз галоўнай рэвалюцыйнай сілай зьяўляецца армія комуністага Іе-Ціна.

Арміяй Іе-Ціна захоплены горад Хайфун, дзе організаваны рэўком, якім кіруе комуністычная організацыя—рэволюцыйны штаб барацьбы працоўных Кітаю.

Польшча і Літва.

Польскія паны, якія мелі ў Літве буйныя маёнткі, пасьля аддзяленьня Літвы страцілі іх. Зямля перайшла да літоўскіх паноў, сялян і рамесьнікаў. Але польскія паны хочуць назад вярнуць свае маёнткі. Падрыхтоўка да гэтага ідзе даўно, а цяпер панская Польшча ўжо адкрыта рыхтуецца выканаць гэты захват.

У паноў два пляны дзеяньня: скінуць цяперашні літоўскі ўрад і замест яго пасадзіць сваіх людзей, якія будуць рабіць усё, што ім будзе загадана з Варшавы; Або стварыць каля літоўскае граніцы новы літоўскі ўрад з польскіх прыхільнікаў і ён з дапамогаю польскіх штыкоў пойдзе на сталіцу Літвы—Коўну.

Калі-ж гэтае наступленьне спаткае супраціўленьне, то на дапамогу самазванаму ўраду Літвы пойдзе ўжо рэгулярнае польскае войска і Літва будзе занята. Такім чынам, ажыцьцёвіцца думка польскіх паноў аб захвапе Літвы, а тады яны здолеюць атрымаць маёнткі.

Цяпер ужо ўсе газэты паведамляюць што захопніцкія пляны польскіх паноў пагражаюць вызваць вайну, і яна можа разгарнуцца ня толькі заграніцай, але можа перакінуцца і на Савецкі Саюз. Захват Літвы польскімі панамі азначае толькі першы крок на шляху да ажыцьцяўленьня яшчэ другога пляну, ужо накіраванага непасрэдна супроць Савецкага Саюзу. Польскія паны адкрыта гавораць аб далучэньні да Польшчы, апроч Літвы, таксама Украіны і Беларусі.

Польская авантура, накіраваная супроць слабае Літвы, высьвятляецца больш ясна. Становішча Літвы пагоршваецца, бо яна ня можа разьлічваць на падтрыманьне Англіі і Францыі. Францыя гатова маўчаць у справе авантуры Польшчы, бо зьнішчэньне незалежнасьці Літвы аслабляе Нямеччыну. Для Англіі-ж захват Літвы Польшчаю—карысны для абкружэньня СССР.

Пілсудзкі карыстаецца такім выгадным становішчам. Усю гэтую паскудную гульню стараецца выкрыць нота СССР да Польшчы Наша дзейнасьць вызывае нездаваленьне польскіх газэт. Польшча стараецца схаваць канцы ў ваду.

Нямеччына падтрымлівае нашу ноту. Англія-ж і Францыя нездаволены нашай нотай.

Пахне порахам.

Мы ідзем у Дзяржаўны Тэатр.

Першае зьвяно ў ланцугу масавых спэктакляў —„АСТАП“. Ставіцца ў суботу, 10-га сьнежня.

Усе комсамольскія ячэйкі купляюць білеты на першы спэктакль для моладзі, наладжваемы клюбам „КІМ“ у Белдзяржтэатры. Білеты каштуюць ад 10 да 70 кап. і прадаюцца кожны вечар у клюбе.

Комсамольцы, усе на колектыўны прагляд „Астапа“!

15—комсамольскі юбілей.

Адзначым яго ўцягненьнем новых кадраў рабочай моладзі ў ЛКСМБ.

15-га сьнежня—9-гадовы юбілей ЛКСМБ. Гэты юбілей пройдзе пад лёзунгамі згуртаваньня комсамольскай організацыі вакол яе кіраўніка—УсеКП(б) і ўцягненьня рабочай моладзі ў комсамол.

Каб не адхіліць увагі організацыі ад 15-га партзьезду, ЦК ЛКСМБ раіла для адзнакі сьвята абмежавацца наладжваньнем урачыстых вечароў па ячэйках і юнсэкцыях.

Прыкладны плян вечару наступны: даклад на тэму ‹9 гадоў ЛКСМБ› (па матар'ялах кнігі Олікера і Розэнблюма (концэртная частка: мастацкая пастаноўка, выступленьні клюбных гурткоў ды інш.

Тэрмін, які застаецца да юбілею павінен быць шырока выкарыстан для прыёму ў ЛКСМБ рабочай моладзі і перадачы ў партыю лепшых комсамольцаў.

На гэтыя грошы пабудуюць новыя фабрыкі.

Беларусь дала 2 з палов. мільёны пазыкі індустрыялізацыі.

Кампанія па падпісцы на пазыку індустрыялізацыі заканчваецца. У горадзе падпіска ўжо спынена, у вёсцы—працягнецца да 15-га сьнежня.

Колькі-ж сабрана грошай?

Па вестках з месц, у БССР прадана облігацый **на 2.500.000 рублёў.** Такім чынам сваё заданьне па пазыцы індустрыялізацыі наша рэспубліка выканала з гакам.

Падпісваліся ў асноўным рабочыя і служачыя. Гэта іх працоўныя рублі пойдуць на пабудову новых фабрык і заводаў. Падпісваліся большай часткай **колектыўна.** У той час, як колектыўная падпіска на 10-процантную пазыку 1927 году складала толькі 22 проц., гэта колектыўная падпіска складае каля 80 проц.

Актыўны ўдзел у рэалізацыі пазыкі прыняла моладзь. На шмат якіх прадпрыемствах комсамольцы і беспартыйныя маладыя рабочыя падпісваліся на 100 проц. сваёй зарплаты.

Лёзунг—„да дзесяцігодзьдзя Кастрычніка облігацыя пазыкі індустрыялізацыі павінна быць у кожнага працоўнага СССР“—амаль што выканан.

Левінскі.

Пачынаюцца перавыбары камітэтаў узаемадапамогі.

Абяром добрых працаўнікоў.

Гэтымі днямі ва ўсёй БССР пачынаюцца перавыбары камітэтаў сялянскай узаемадапамогі.

ЦК камітэтаў узаемадапамогі высоўвае ў якасьці грунтоўных задач гэтай кампаніі **больш асьцярожны падыход з боку насельніцтва да складу новаабіраемых камітэтаў.** Павінны быць абраны таварышы, якія паказалі сябе на грамадзкай працы, як партыйцы і комсамольцы, гэтак і беспартыйны актыў з ліку батракоў, беднякоў і серадиякоў.

$1^{1}/_{2}$ мільёны рублёў на землеўпарадкаваньне.

У бягучым гаспадарчым годзе адпушчана па дзяржаўным бюджэце 600 тысяч і з сродкаў Белсельбанку 900 тысяч рублёў на землеўпарадкаваньне сялянскіх гаспадарак.

Гэтыя грошы будуць разьмеркаваны ў якасьці доўгатэрміновага крэдыту паміж землеўпарадкаваемымі гаспадаркамі для набыцьця сельска-гаспадарчага інвэнтару, жывёлы, пераносу будынкаў ды інш.

На шматпольле!

Наркамзем зараз праводзіць інтэнсыўную працу па пераводу на шматпольны севазварот сялянскіх гаспадарак.

За 1927 год усяго пераведзена на шматпольле 85·895 дзесяцін зямлі, што дае павялічэньне ў параўнаньні з мінулым годам на 24 проц.

Дапамога беднякам.

Белсельбанк асыгнаваў 350 тысяч рублёў на крэдытаваньне бяднейшага сялянства да вясеньняй пасяўной кампаніі.

Гэтыя грошы прызначаюцца на забесьпячэньне сялян рагатай скацінай.

Зьезд яўрэяў-сялян.

Нацкамісія ЦК БССР ухваліла склікаць на 20-га студзеня ўсебеларускі зьезд яўрэяў-сялян.

На зьезд чакаецца з месц 200 дэлегатаў; а таксама прадстаўнікі яўрэйскіх сялян з РСФСР і іншых нацрэспублік.

Прыём у школу павароў.

Пачалося ўкомплектаваньне Менскай школы павароў пры МЦРК, якая адчыніцца ў пачатку 1928 году.

Набор слухачоў школы адбываецца выключна праз юнсэкцыю Менскай біржы працы. Усяго будзе прынята 30 падросткаў.

Як будзе працаваць Інстытут Працы.

У бягучым гаспадарчым годзе Наркампрацы вызначыў прапусьціць праз Менскія курсы Цэнтральнага Інстытуту Працы 760 чалавек.

За гэты тэрмін адбудзецца выпуск трох цэхаў: сьлясарнага, які скончыць 300 чалавек, будаўнічага, які скончаць 360 чалавек і дрэваапрацовачнага—100 чалавек.

10 год ДПУ.

У студзені 1928 году адбудзецца 10-гадовы юбілей існаваньня ВЧК АДПУ (Аб'яднаная Дзяржаўная Політычная Управа).

Да гэтай гадавіны па Заходняй Вайсковай акрузе прыстасоўваецца кампанія падагульненьня вынікаў 10-гадовай работы ВЧК-АДПУ па замацаваньню дыктатуры пролетарыяту і барацьба з контр-рэволюцыяй.

Студэнты ваенізуюцца.

За апошні час значна разгарнулася ваенізацыя ў БДУ. Са студэнтамі праводзяцца сталыя вайсковыя заняткі практычнага і тэорытычнага характару ў выглядзе стральбы, азнаямленьня са строем, вывучаньня тактыкі і топографіі.

Пры БДУ абсталяван таксама вайсковы габінэт, дзе ёсьць вінтоўкі, кулямёты, процівагазы і вайсковая літаратура.

Новая часопісь.

Гэтымі днямі выходзіць з друку першы нумар новай літаратурнай часопісі **„Росквіт“**—органу Беларускай Літаратурна-Мастацкай Комуны.

У нумары зьмешчаны апавяданьні і вершы **А. Гародні, Прыбыткоўскага, Атавы, П. Шукайлы** і інш.

Памер часопісі—10 друкаваных аркушаў

Чэрвенцы паказалі сябе.

Комсамольцы Чэрвенскага раёну падпісваліся на пазыку колектыўна, ячэйкамі, і індывідуальна. Кампанія закранула вёску.

3 гарадзкія ячэйкі сабралі 418 рублёў пазыкі. Асабліва вызначаецца комсамолка **Філінюк** (вытворчая ячэйка № 1), якая жывучы бедна, на маленькую 25-рублёвую пэнсію, падпісалася на 30 рублёў.

Вясковыя комсамольцы падпісаліся агулам на 585 рублёў. Шмат, якія вясковыя ячэйкі падпісваліся колектыўна. Не правялі гэтай працы толькі тры ячэйкі—Кліноцкая, Раваніцкая і Калодзіцкая.

У агульным чэрвенская комсамолія дала 1000 рублёў пазыкі, што для організацыі з 300 чалавек, з якіх большая частка беднакі,—вялікае дасягненьне.

М. К.



Комсомольцы Віцебску, перадаными ў партыю.

Рабочая моладзь у комсамол.

Віцебск, 7 сьнежня. Рабочая моладзь папаўнае шэрагі комсамолу. Падалі заявы па гарадзкіх раёнах 112 чалавек.

У партыю Леніна.

На 3 сьнежня па Віцебскай акрузе падана 431 заява рабочых аб прыеме ў партыю.

Па гораду Віцебску на першым месцы ідзе другі раён, падана 224 заявы.

На другім месцы трэці раён—88 і на трэцім месцы першы раён—87.

Па акрузе. Гарадоцкі раён—18, Высачанскі—9 і Чашніцкі—5.

364.

(Ад нашага корэспондэнта).

Гомель 6 сьнежня. Рабочая моладзь адказвае на выпадкі опозіцыі, яшчэ большым згуртаваньнем вакол комсамолу. На 1-е сьнежня падало заявы 364 ч. Падаўшыя выключна рабочы маладняк з вялікім вытворчым стажам.

З іх па гар-раёну падало заявы—140 ч., па Залінейнаму—91 ч., Добрушскаму—57 ч., Новабеліцкаму—41 ч. і Рэчыцкаму—35 ч.

150 заяў.

Гомель (наш. кор.) **150** чалавек лепшых актывістых-комсамольцаў перададзены ячэйкамі ў партыю.

Перададзеныя ў партыю выконвалі чорную комсамольскую працу. Перададзеныя выключна рабочыя.



„Железная Стена“.

(Пастаноўка ‹Расійскай Драмы›).

Прынцы і каралі ня робяць рэволюцый. Калі хто-небудзь з іх замышляе аб нечым рэволюцыйным, дык гэтая „рэволюцыйнасьць“ выяўляецца толькі ў гарачых прамовах і жэстах і то не надоўга.

У насьледнага прынца Вальтляндыі—Фрэдзі было два жыцьці. Адно жыцьцё—у пышных каралеўскіх палацах, поўнае роскашы і афарбаванае старасьвецкім этыкетам, і другое—у рабочай ваколіцы вялікага гораду. Там прынц пад выглядам беднага студэнта знаёміўся з жыцьцём. Фрэдзі Рук—студэнт, Фрэдзі—сябра баявой організацыі, Фрэдзі—выдатны рэволюцыйны прамоўца.

Прынц весь поўны рэволюцыйных ідэй і думак. Ён марыць аб тым, што, калі стане каралём, дык адмовіцца ад трону і абвесьціць Вальтляндыю рэспублікай. А покуль што ён чакае.,. У пышных палацах—ён прынц, у рабочым прадмесьці—студэнт-рэволюцыянэр.

Расьце рэволюцыйная хваля. Рыхтуецца паўстаньне. І на лёс студэнта Фрэдзі Рука выпала задача забіць караля, бацьку прынца Фрэдзі; гэта забойства павінна пакласьці пачатак паўстаньню.

У самы рашучы момант у Фрэдзі не хапіла моцы забіць бацьку і гэта зрабіла яго падруга жыцьця—рэволюцыянэрка Кэці. Паміж ім і рэволюцыйнымі рабочымі вырасла жалезная сьцяна. Ён сам гаворыць аб сабе: „Фрэдзі Рук быў вялікі няўдачнік. Нават пры дапамозе насьледнага прынца, ён ня здолеў прабіць жалезную сьцяну“.

Пастаноўка „Расійскай Драмы“ паказала, што мы зараз маем у Менску моцны тэатральны колектыў.

Тут няма асаблівых «ухищрений» у пастаноўцы—цэнтральная ўвага зьвернута на гульню. А гульня ўсіх артыстых на вышыні. Кожны на сваім месцы, адчуваецца вялікая зыгранасьць, добрае разуменьне кожным артыстым сваёй ролі.

У ролі прынца Фрэдзі—Алегаў. Вельмі жыцьцёва і глыбока перадае ён драму насьледнага прынца—студэнта-рэволюцыянэра Фрэдзі. Ролю рэволюцыянэркі Кэці выконвае артыстка Белікава. Проста і яскрава дае яна тып рабочай дзяўчыны, аддаўшай усё сваё жыцьцё рэволюцыйнай барацьбе.

Удалая пастаноўка!

Таубэ М.

„Парыжанка“.

(Кіно ‹Чырвоная Зорка›).

Чарлі Чапліна мы да гэтага часу ведалі, як добрага комэдыйнага артыстага. Шмат вострай сатыры на сучасную буржуазію даў Чарлі Чаплін таленавітымі вобразамі сваёй гульні.

У „Парыжанцы“ Чарлі Чаплін выступае ў ролі рэжысэра. Гэта давала нам права чакаць ад фільму шмат чаго цікавага і орыгінальнага.

Цяжка сказаць, што жадае паказаць „Парыжанкай“ сцэнарысты—рэжысэр Чаплін. На працягу 8 частак малюецца драма двух закаханых, лёс якім перашкаджае дабіцца ўзаемнага шчасьця. Маленькая сэнтымэнтальная драма ў вялікім фільме—і больш нічога.

Няма ні самабытнасьці, ні орыгінальнасьці, усё зроблена па старых рэжысэрскіх традыцыях—у выглядзе „спакойнага фільму“.

Гэроі гуляюць у „жураўля і цаплю“. Калі адзін хоча пажаніцца—ня хоча другая і наадварот. Якая „мараль“ адсюль—невядома.

Зусім незразумелы тып Мары Сэн-Клёр—галоўнай гэроіні. Ці дае яна сапраўдны вобраз утрыманкі аднаго з буржуазных панес?—гэтага сказаць нельга.

Чаплін скупіўся на надпісы, і ў выніку шмат якія месцы атрымаліся незразумелымі.

У дадатак да гэтага некалькі момантаў парнаграфіі.

Занадта шмат ужо там гэтых самагубстваў, тэндэнцый на сантымэнтальныя сьлёзы мяшчанскага гледача.

Нів. А.

Суд

Адразу не ўдалося

Старшынёю Пятровішчанскага сялянскага камітэту ўзаемадапамогі быў Пашкоўскі, а сэкратаром Вагасэвіч.

— Шмат працы,—часам казаў Вагасэвіч старшыні!

— Нічога! справімся. Гэта, брат, ня праца. А вось я думаю распачаць працу.

— Што? можа пні зьбіраць?—Не?

— Давай будзем весьці барацьбу з самагоншчыкамі?

— Давай!—адказаў Вагасэвіч.—Але, знаеш што?

— А што? А як наконт, каб гэта—нелаеш?

— Выпіць? Будзе, брат, будзе, хоць залівайся!

— Толькі вось што, пратаколы будзем складаць.

— Складзем, а там калі падручна і зьнішчым.

Закіпела праца. Пашкоўскі і Вагасэвіч пашлі па вёсках, за адзін дзень яны адабралі ў самагоншчыкаў каля паўвядра самагонкі, склалі ледзь ня пяць пратаколаў, а нарэшце напіліся, як смаўжы і згубілі пратаколы.

Менскі Акруговы Суд прыгаварыў: Пашкоўскага і Вагасэвіча на адзін год зьняволеньня, але на аснове амністыі 10 гадавіны Кастрычнікавае рэволюцыі ад пазбаўленьня волі вызваліў.

А. Д. Катроў.

„Гульня ў Індыйцаў“.

Гэройскія паходжаньні Гомельскага комсамольца Рохліна ў опозіцыйным падпольлі.

„Прачытаўшы, парві.

Міна! Я пішу аб гэтым асобна, таму што, папершае, не хачу, каб аб гэтым ведаў хто-небудзь іншы, падругое, каб ты адразу-ж пасьля прачытаньня зьнішчыў-бы старонкі 5 і 6. Тую палову ліста, да 5-й старонкі, 7 і 8, можэш (абавязкова) прачытаць хлапцам.

Гэта я таксама хачу.

Няхай ведаюць, што трэба быць адказным за слова. Комсамольцы, а яшчэ слова ня выконваюць.

А гэта, прачытаўшы, парві.

Вось у чым справа. Я ў Маскве зышоўся з выдатнымі лідэрамі опозіцыі, якія мяне ўцягнулі ў падпольную фракцыйную працу і мяне пераканалі ў правільнасьці іх політыкі.

Я з гутаркі Радэка пераканаўся, што барацьба (ды яшчэ падпольная) рэч вельмі цікавая і неабходная.

Я і Пашка і яшчэ іншыя хлапцы вельмі актыўна працуем у падпольнай організацыі бальшавікоў-ленінцаў (опозіцыянэраў)“.

На чале гэтай організацыі Леў Давідавіч (Л. Д.—„любезны друг“,—як мы яго называем) пад непасрэдным кіраўніцтвам і ўдзелам Зіноўева, Каменева, Радэка, Ракоўскага, Праабражэнскага і інш.

Мы творым справы, „абдурваем“ сталінцаў, падводзім іх, але баімся вобыскаў, а сваё робім.

Мы (цэлая група хлапцоў) надрукавалі ў тысячах экзэмпляраў адозвы і іншыя рэчы, распаўсюджваем іх сярод заводаў і фабрык і г. д.

Групу хлапцоў ужо арыштавалі, мабыць, дабяруцца і да нас калі-небудзь, але пакуль што ўсё гэта робім вельмі конспіратыўна і зусім сакрэтна. У нас нават свой шыфр, пароль і псэўдонімы. Дык вось якавы нашы справы.

Я табе пісаў ужо. У лісьце не апішаш усё, трэба шмат часу, каб аб усіх маіх прыгодах расказаць.

Ёсьць шмат вельмі камічных, але рызыкоўных нумароў працы.

Напрыклад, мне далі даручэньне падкінуць адозву Троцкага, Зіноўева і інш. (усяго 13 партыйцаў—членаў ЦК і ЦКК—опозіцыянэраў, якія знаходзяцца ў Маскве) к аўтомобілю Яраслаўскага, пры яго паездцы к варотам Крэмлю.

Мне паведамілі час, калі ён павінен пад'ехаць.

Я ўзяўся (воляй-няволяй, такая ўжо опозіцыйная дысцыпліна) за гэтую справу.

Няхай Яраслаўскі крыху ашчацініцца.

Так! Дык я вось гэта рашыў зрабіць.

Хадзіў „вакол, ды каля“—каля гадзіны чакаў. Раптам паказваецца аўтомобіль і хутка імчыцца да варот. Я падняў руку і кінуў паперку ў аўто, а сам марш з пляцу па бульвары на трамвай і... да хаты.

Назаўтра мне расказваў мой кіраўнік (кожная група хлапцоў мае кіраўніка), члена партыі, што Радэк расказаў яму, як хтосьці яму кінуў у аўтомобіль пісаную ім-жа адозву.

Усе рассьмяяліся і ніхто нават да гэтага часу ня ведае, што гэта я. Мне нават самому сорамна сказаць. Бо я-ж павінен быў кінуць Яраслаўскаму, а пераблытаў аўтомобілі.

Вось якія гісторыі бываюць. Ня тое, што ў Гомелі, ніхто нават ні аб чым ня ведае. Атрымоўваюць толькі гатовы матар'ял па газэце, ня ведаюць ні аб якіх дакумантах, чытаюць толькі ў газэце, што выключаны той і той за распаўсюджаньне нелегальных дакумантаў і г. д., а нашых дакумантаў ня ведаюць. Прымаюць рэзолюцыі протэсту супроць фракцыйнай барацьбы і г. д. Гэтых людзей, прымаючых рэзолюцыі (таму што баяцца), мы называем „быдлам“

Вось у агульным ёсьць аб многім чаго пісаць, але вельмі сьпяшаюся. Бачыш, як почарк ужо сапсаваўся. Вось я канчаю.

Пасылаю табе напісаную нашымі хлапцамі поэму (опозіцыйную), пастарайся перапісаць пад капірку і распаўсюдзіць сярод надзейных людзей.

Толькі вось што, пішы аб тваіх адносінах да опозіцыі, да Троцкага, да актыўнай барацьбы і г. д.

Я канчаю, абавязкова напішы зараз-жа і не пазьней, чым праз дзень-два. Прытым пішы адрас так: Масква, 17, Калужская Плошча, Крымскі вакзал 14, кватэра 4, А. Эльцінай, для Моціна, але ня Рохліну, і прытым ня пішы твой зваротны адрас на конвэрце. Вось усё. Ня бойся, пішы падрабязна. Да пабачаньня. Моцін (Мадаро). Марк Давідавіч Рохлін“.

* * *

Цяжка распаўсюджвацца ці рабіць комэнтарыі да прыведзенага вышэй дакуманту Ён гаворыць сам за сябе.

Самае цікавае ў ім гэта, вядома, тое, што дакумант не фэльетонны, ня створаны, а самы сапраўдны.

Піша ня Саша Хлестакоў душы—Трапічкіну, а зусім рэальны чалавек,—ды яшчэ прадмет увагі опозіцыянэраў—Марк Давыдавіч Рохлін.

Аўтар лісту паслаў яго сваім землякам—комсамольцам у Гомель, тыя, добра пасьмяяўшыся, перадалі ў Акр. КК, а Акр. КК пераслаў адкрытнасьць МаДаРо ў Маскву, у ЦКК.

Вядома, гомельскія комсамольцы зьдзіўлены і абураны такімі ўчынкамі юнага гэроя ў троцкісцкім падпольлі («ня тое, што ў Гомелі!»).

Калісь гімназістыя, захапіўшы з сабой 60 кап. і ручку ад грамафону, беглі ў Амэрыку, каб з плачам зьвярнуцца назад з вакзалу.

Зараз—справа прасьцей. Ці жарты!

Сам „любезны друг“ кіруе гэроічнымі ўчынкамі,—ці бачылі вы што-небудзь падобнае?

Добра яшчэ, што МаДаРо ў апошнюю хвіліну пасьпеў унікнуць ад страшэннай небясьпекі, у час уцёкшы на трамвай.

Дух захоплівае ад такіх перажываньняў.

На фоне трагічнага бэнгальскага агню, які пускае вакол сябе опозіцыя, Марк Давідавіч Рохлін выдае яе нявыгадным камічным сваім абліччам.

Што зробіш?

Здаровы сьмехнікому не забараняецца.

І затым—чаму крыўдзіць адданага МаДаРо, чаму замоўчваць гэту не апошнюю вялікасьць у сузор'і Зіноўеў-Маслаў!

В. Л.

Галоўлітбел № 24867.

Адказныя рэдактары: (А. Бараньнікаў (А. Курцік

1-ая дзяржаўная друкарня.